УДК 398(=836)(075.8)
ББК 82.3(4Беи)73
П12

Складальнікі:
**В. В. Прыемка, Т. А. Марозава,**
**Т. В. Лук'янава, В. К. Каратай**

Рэкамендавана вучоным саветам
філалагічнага факультэта
29 кастрычніка 2009 года, пратакол № 2

Рэцэнзенты:
кандыдат філалагічных навук *А. Ф. Літвіновіч*;
кандыдат гістарычных навук *М. А. Міхайлец*

**Пазаабрадавыя** песні : метад. указанні і іл. матэрыял да пра-
П12 вядзення фальк. практыкі студэнтаў I курса філал. фак. / склад. : В. В. Прыемка [і інш.] ; пад рэд. Т. А. Марозавай. — Мінск : БДУ, 2010. — 115 с.
ISBN 978-985-518-372-4.

Кніга дапаможа будучым філолагам у падрыхтоўцы да фальклорнай практыкі ў палявых умовах, а таксама ў фарміраванні прадметнай кампетэнцыі. Выданне будзе карысным кіраўнікам груп фальклорнай практыкі, выкладчыкам па фалькларыстыцы, а таксама работнікам культурных устаноў.

**УДК 398(=836)(075.8)**
**ББК 82.3(4Беи)73**

**ISBN 978-985-518-372-4**

© БДУ, 2010

# ПРАДМОВА

У навуковай літаратуры існуе праблема класіфікацыі пазаабрадавай лірыкі. Гэта зразумела, таму што ў жанрава-відавым плане фальклор вельмі багаты. Прапанаваць ідэальную класіфікацыю, у якую б «укладваліся» абсалютна ўсе творы, — справа не з лёгкіх. Год ад году сутыкаючыся з рэальнымі сітуацыямі складанасці вызначэння жанрава-відавой прыроды пэўнага твора, мы паспрабавалі ўлічыць, з аднаго боку, усе вядомыя ў фалькларыстыцы падыходы да класіфікацыі пазаабрадавай паэзіі, з другога — ахапіць магчымыя варыянты цяжкіх прыкладаў, якія не падпадаюць пад вядомыя класіфікацыі. У выніку сістэма беларускай пазаабрадавай лірыкі атрымала наступны выгляд: падзел на *бытавыя і сацыяльныя*, *гумарыстычна-жартоўныя і сатырычныя песні*, а таксама на малыя лірычныя жанры — *прыпеўкі*. Акрамя гэтага, звяртаецца ўвага на ўнутрывідавую класіфікацыю бытавых і сацыяльных песень. Пры вызначэнні відавой разнавіднасці твора прапануецца, з аднаго боку, адмовіцца ад абагульненага паняцця «лірычная песня», з другога — аб'яднаць бурлацкія, батрацкія, адыходніцкія і песні панскіх парабкаў у групу «найміцкія песні». Дадзеныя ўдакладненні зроблены на падставе справаздач па фальклорнай практыцы некалькіх пакаленняў студэнтаў-філолагаў і заўважаных недахопаў пры вызначэнні імі відавой разнавіднасці твораў.

У гэтым выданні мы змяшчаем і жорсткія рамансы — творы, якія традыцыйна не адносяцца да ўласна пазаабрадавых песень, але добра ілюструюць пазаабрадавую сферу жыцця беларуса. Агульнавядома, што жорсткія рамансы абавязаны сваім узнікненнем гарадской мяшчанскай культуры, аднак іх стабільная фіксацыя студэнтамі ў асяроддзі вясковага насельніцтва паўсюдна па Беларусі сведчыць аб папулярнасці гэтага жанру, яго пранікненні ў традыцыйную культуру вёскі. На нашу думку, уяўленне аб функцыянаванні пазаабрадавай лірыкі без гэтага жанру будзе няпоўным.

У якасці ілюстрацыйнага матэрыялу выкарыстаны запісы студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, зробленыя на працягу апошніх 5—15 гадоў, што з'яўляецца сведчаннем захаванасці пазаабрадавага песеннага фальклору ў жывым бытаванні нашага народа. З-за адсутнасці запісаў некаторых відавых разнавіднасцей змяшчаюцца тэксты твораў, запісаныя падчас выязных фальклорных экспедыцый канца 60-х гг. — пачатку 90-х гг. ХХ ст. Па магчымасці складальнікі імкнуліся прадставіць матэрыялы з розных абласцей і раёнаў Беларусі, каб адлюстраваць поўную карціну бытавання пазаабрадавых песень, жорсткіх рамансаў і прыпевак.

У дадзеным выданні вытрыманы базавыя прынцыпы: арыентацыя на фарміраванне ў студэнта-збіральніка фальклору прадметнай кампетэнцыі і забеспячэнне яго неабходным метадычным інструментарыем па вызначанай тэме.

# I. БЫТАВЫЯ ПЕСНІ

У гэтай групе песень вылучаюцца *любоўныя*, *сямейныя*, *сіроцкія*, *удовіныя*, *прымацкія*, *элегічныя* творы, звязаныя з пазаабрадавай сферай жыцця чалавека. Калі вы параўнаеце прапанаваную жанравую класіфікацыю з той, якая змешчана ў Зводзе беларускага фальклору «Беларуская народная творчасць»*, то заўважыце, што названыя разнавіднасці песень пададзены крыху інакш: асобнымі тамамі прадстаўлены любоўныя песні і сямейна-бытавыя — *уласна сямейныя*, *сіроцкія*, *удовіныя*. У плане класіфікацыі гэта тыя ж творы, якія мы прапануем пад агульнай назвай «бытавыя песні». Прымацкія песні ў Зводзе змешчаны ў томе «Сацыяльна-бытавыя песні». На нашу думку, прымацтва, як яго традыцыйна разумеў народ, — з’ява сямейная, а не сацыяльная: скаргі на долю мужа-прымака лічыць сацыяльным пратэстам не зусім карэктна.

Даволі часта і ў навуковых даследаваннях, і ў зборніках фальклорных твораў можна сустрэць такое словазлучэнне, як «лірычная песня». Выкарыстоўвачы гэты тэрмін, карыфеі беларускай фалькларыстыкі Н. С. Гілевіч і А. І. Гурскі падкрэслівалі, з аднаго боку, прыналежнасць твора да пазаабрадавай сферы, з другога — надзвычайную прыгажосць, мастацкую вартасць беларускіх пазаабрадавых песень [11, 15—17, 26]. На нашу думку, прымяненне тэрміна «лірычная песня» міжволі прыводзіць да размывання жанрава-відавых меж, у выніку чаго студэнты не звяртаюць увагу на ўнутрывідавую або ўнутрыжанравую спецыфіку твора. Дадзеная акалічнасць робіць недакладным практычнае прымяненне тэарэтычных ведаў, атрыманых студэнтамі на лекцыях, практычных і семінарскіх занятках.

**Парада.** Пры жанрава-відавой атрыбуцыі пазаабрадавай бытавой лірыкі пазбягайце ўжывання абагульненага паняцця «лірычная песня», выкарыстоўвайце прапанаваную класіфікацыю: *песні любоўныя*, *сямейныя*, *сіроцкія*, *удовіныя*, *прымацкія*, *элегічныя*.

*Далей гл. прынятую ў беларускай фалькларыстыцы абрэвіятуру : Звод БНТ.

Кожная з тэматычных разнавіднасцей песень мае свае характарыстыкі, таму іх можна распазнаць і правільна вызначыць.

*Любоўныя песні* (*песні пра каханне*) прысвечаны тэме кахання — шчаслівага, нешчаслівага, ідэальнага і г. д. У цэнтры твораў — лірычны герой (дзяўчына ці хлапец), яго эмацыянальна афарбаваныя роздумы, пачуцці і перажыванні. Формай іх перадачы, як правіла, з'яўляюцца маналагічныя споведзі-прызнанні, споведзі-скаргі, дыялогі. Важны момант у перадачы псіхалагічнай карціны любоўнага перажывання належыць пейзажным замалёўкам.

**Парада.** Часта ў якасці аб'екта кахання дзяўчыны выступае хлапец-*казачэнька*. У традыцыйнай лірыцы гэта тыповы вобраз маладога нежанатага хлапца, а зусім не ўказанне на сацыяльную прыкмету: казакі як асобная група з'яўляюцца цэнтральнымі вобразамі-персанажамі ў *сацыяльных казацкіх песнях*. Каб не заблытацца ў вызначэнні разнавіднасці песні, уважліва прачытайце тэкст твора, вылучце яго тэму і калізію. Калі твор пра дзяўчыну і хлапца-казачэньку — перад вамі тыповая любоўная песня.

У *сямейных песнях* распрацоўваюцца тэмы сямейнага дэспатызму і жаночай долі. Асноўныя матывы — сум па роднай хаце і бацьках (праз успаміны і звароты да братоў і родных), скаргі, слёзы і праклёны прыгнечанай нявесткі, папрокі зяцю ад цешчы, нараканні на мужа-п'яніцу і г. д. Сустракаюцца, хоць і рэдка, песні, дзе гаворыцца аб добрым і чулым свёкры і, наадварот, скаргі дачкі на бацькоў, якія аддалі замуж далёка ад дому. Асобную групу складаюць песні-аповеды пра ўзаемаадносіны жонкі і мужа, жыццё з нялюбым (нялюбай) ці старым мужам, нявернасць мужа (радзей — жонкі) і г. д. Названыя творы ў большасці сваёй спявалі жанчыны.

*Сіроцкія і ўдовіныя песні* прысвечаны тэме няшчаснага, складанага лёсу дзяцей і ўдавы пасля страты бацькоў і мужа. Для іх характэрны матывы скаргаў на долю, слёз, пакут у перадачы шчымлівага болю, зварот да памерлых, долі, Бога (Гасподзь Бог навучае сірату, як і дзе знайсці сваю мамку, і г. д.). Форма арганізацыі твора, як правіла, аповедна-дыялагічная.

*Прымацкія песні* алюстроўваюць сямейныя жаночыя песні, з той толькі розніцай, што ў іх жаліцца на свой лёс прымак, які жыве ў хаце жонкі. Часам сярод прымацкіх песень сустракаюцца творы жартоўна-гумарыстычныя.

У асобную групу прапануем вылучаць *элегічныя песні*. Паводле класіфікацыі В. Е. Гусева, названыя песні падобныя да песень пра каханне, таму што вызначаюцца такім жа лірызмам, перадачай пачуццяў і настрояў.

Іх адрозненне — у вобразнай сістэме твора: у элегічных песнях суб'ект перажывання (хлапец, дзяўчына) не прадстаўлены, акцэнт змешчаны на апісанні прыроды (пейзажныя малюнкі), радзей — на інтэр'ер хаты, у іх перадаецца агульны характар перажывання.

## ЛЮБОЎНЫЯ ПЕСНІ (ПЕСНІ ПРА КАХАННЕ)

### СОХНЕ, ВЯНЕ РУЖА-КВЕТКА...

*Запісана ў в. Рудзевічы Зэльвенскага раёна ад Л. М. Бублей (1927 г. н.)*

Сохне, вяне ружа-кветка
У зялёным садочку.
Занядужыла дзяўчына,
Не спіць шосту ночку.

Занядужыла дзяўчына,
Не ходзіць гуляці.
— Чым жа ты хворая, дачушка? —
Пытаецца маці.

— Закружылася галоўка,
Сэрдэнька баліці.
Ой, не знаю, не ведаю,
Як мне пяражыці.

— Навару табе, дачушка,
Ліпавага цвету.
— Дай мне, мамачка, сменіцы,
Каб не ўбачыць свету.

— Навару табе, дачушка,
Ад сардэчнай болі.
— Дай мне, мамачка, атруты,
Каб не ўстаці болей.

— Глянь, дачушка ты мая,
Навіна якая:
Каля хаты хлопец ходзіць,
Ў акно паглядае.

— Дай мне, мамо, тую хустку,
Што я вышывала:
Адлягла боль ад галоўкі,
На сэрцы лёгка стала.

*Запісала В. Х. Кніга*

### СВЕТЫЦЬ МЕСЯЦ, СВЕТЫЦЬ ЯСНЫЙ...

*Запісана ў в. Лопча Пінскага раёна ад В. І. Сашнянінай (1945 г. н.)*

Светыць месяц, светыць ясный,
А зоранькі мігоцяць.
Не пускае мэнэ маты
В сад зэлэны пагуляты.

— Пусты мэнэ, моя мамко,
Я там довго нэ буду,
Там шчэбэчэ соловейко —
Я его послухаю.

— Нэ поможэ тобэ, доню,
Нэ поможэ моя річ.
Одчінэ свое оконцэ —
Слухай яго цэлу ніч.

*Запісала Ю. А. Бразоўская*

## ВОЗЬМУ Я ВЭДЭРЭЧКО...

*Запісана ў в. Парахонск Пінскага раёна ад Г. І. Еўтух (1932 г. н.)*

Возьму я вэдэрэчко
Да й по воду пойду.
Там мілога побачу,
На мілога пагляджу.

Набрала я вады,
Да й стала і стаю
І чую: дзесь мой мілы
Спявае ў гаю.

Нэ сам жа вун спявае,
Нэ сам жа вун у гаю,
Да сэрца прыгадае
Падружэнку маю.

— Падружка ты, падружка,
Падружэнька моя,
Нэўжэлі ты, падружка,
Ў любові нэ была?

— Ў любові я бывала,
Засватана была,
Но я нэ віновата,
Што любіць вун мэня.

— Падружка ты, падружка,
Нэ думай ты таго,
Бо ўжо чатыры годы,
Як я люблю яго.

Бо ўжо чатыры годы,
Бо ўжо чатыры дня,
Прывыкла я до яго,
Як малое дзіця.

*Запісала Ю. А. Бразоўская.*

## ОХ, КАК ЖЭ МНЭ ЛЮБІТЫ...

*Запісана ў г. п. Лагішын Пінскага раёна ад А. М. Лінкевіч (1929 г. н.)*

Ох, как жэ мнэ любіты?
Ох, как жэ мнэ кохаць?
Ёсць у тэбэ другая, } *2 разы*
Дай будэ проклінаць. }

Седлайце, хлопцы, коны,
Седлайце вороны,
Поедэмтэ шукаты
Покрасівей еі. } *2 разы*

— Мы коні нэ седлаем,
Сэдэльцэ не дамо,
Любі тую дэўчыну,
Ктору любіў даўно. } *2 разы*

*Запісала Т. У. Чарняўская ў 2006 г.*

## ВІШЭНЬКА-ЧЕРЕШЭНЬКА...

*Запісана ў в. Хорск Столінскага раёна*
*ад І. М. Якімовіча* (*1935 г. н.*)

Ой, вішэнька-черешэнька шчэ й не родзіць.
Молода й дзевчінка шчэ й гуляць не ходзіць.
Молода й дзевчінка шчэ й гуляць не ходзіць.

— Ой, як жа мне гуляці ходзіць — лісце опадае,
Лісце опадае — мілы спокідае.
Лісце опадае — мілы спокідае.

Ой, вішэнька-черешэнька стоіць пад рекою.
Взяла дзевка новы ведры, пошла за водою.
Взяла дзевка новы ведры, пошла за водою.

Стала дзевка воду браці, на каменне стала,
Задзівілась на чарнявого ды й у воду ўпала.
Задзівілась на чарнявого ды й у воду ўпала.

Мілый бегае по беражку і крычыць: «Ратуйце!»
А дзівчына отвечае: «Покінь, не жалкуйце.
Надо было жалковаці, як была жывая.
Надо было жалковаці, як была жывая».

«Надо было жалковаці, як была жывая,
А цяпера надо мною вішня чарашнява.
А цяпера надо мною вішня чарашнява».

*Запісала Н. У. Дранец*

## УСЁ ПАСОХЛО, УСЁ ПАВЯЛО...

*Запісана ў в. Рубель Столінскага раёна*
*ад Н. Х. Котка (1933 г. н.)*

— Усё пасохло, павяло,
А ты, траўка, зеляней.
Мяне дома не жалеюць,
А ты, мілы, пажалей.

— Пажалеў бы цябе, міла,
Каб я думаў цябе браць,
Чэраз месяц, чэраз другой
Я надумаўся брасаць.

— Як надумаўся брасаці,
Так брасай жа паскарэй,
Толькі тайного словечка
Нікому не вымаўляй.

— Ёсць у мяне сестра старша,
Будзе кумоў набіраць.
Давай мілы пакумімся —
Всё равно нам не гуляць.

Всё равно нам не гуляці,
Всё равно не шчабятаць,
Майму сэрцу будзе легшэ
Цябе кумам называць.

Калі роза расцвітала,
Ты募 стараўсь яе сарваць,
Калі розачка савяла,
Ты стараешся стаптаць.

Калі я была красіва,
Ты стараўсь мяне любіць,
А цяпер я стала няшчасна —
Ты стараешся забыць.

*Запісала Н. А. Пашкевіч у 2007 г.*

## У СЕРАДУ РАДЗІЛАСЯ...

*Запісана ў в. Морач Клецкага раёна*
*ад М. І. Цыган (1939 г. н.)*

У сераду радзілася
Гора, маці, гора.
Кажа маці валы гнаці
На чужое поле.

Не паганю сівых валоў
На чужое поле,
Не пайду я за старога:
Барадою коле.

А пайду я за такога,
Што не мае вусаў.
Ён на мяне кіўне-моргне,
А я засмяюся.

*Запісала А. А. Ілюкевіч у 2007 г.*

## ОЙ, БОРАМ, БОРАМ, БАРВІНОЮ...

*Запісана ў в. Красная Лідскага раёна*
*ад Н. П. Рудзевіч (1926 г. н.)*

Ой, борам, борам, барвіною
А хто ж там едзе вечарыною?
А хто ж там едзе вечарыною?

Ой, едзе, едзе Ванечка п'яны:
— Адчыні, Манька, варотца пані.
Адчыні, Манька, варотца пані.

— Ой, я не пані, не панянэчка,
Я ў сваім доме гаспадынэчка.
Я ў сваім доме гаспадынэчка.

Папырскаў дожджык, на ганку слізка.
Скланіўся Ванька Маняццы нізка.
Скланіўся Ванька Маняццы нізка.

А як скланіўся, ды й прытуліўся:
— Верна, я, Манька, ў цябе ўлюбіўся.
Верна, я, Манька, ў цябе ўлюбіўся.

— Пастаўлю слончык і каладэчку,
Пасаджу Маню, як панянэчку.
Пасаджу Маню, як панянэчку.

Ой, сядзі, сядзі, каб ты ні ўстала,
Як ты младэму свет завязала.
Як ты младэму свет завязала.

*Запісалі І. У. Шах*
*і У. Ю. Камінскі ў 2006 г.*

## ГНЕВАЕЦЦА МАЦІ...

*Запісана ў в. Магдален*
*ад Г. В. Гуцько (1927 г. н.)*

Гневаецца маці,
Ды ўсё хоча біць.
Перастань ты, горды хлопец,
Да мяне хадзіць.

— Я не перастану,
Бо цябе люблю.
Як распусціць верба лісце,
То тады вазьму.

Дзеўка здагадалась:
Вербу падліла.
«Можа, скора выйду замуж»,
Думала яна.

Распусціла верба
Лісце на дварэ.
Хлопец дзеўку толькі зводзіў —
Замуж не бярэ.

— Паглядзі, дзяўчына,
Камень у вадзе.
За мяне ты выйдзеш замуж,
Як ён паплыве.

— Дзе ж гэта ты бачыў,
Каб той камень плыў.
— Бела лічка, чорны бровы
Навек засмуціў.

*Запісала Д. П. Сідарук у 2006 г.*

## ТАМ, КАЛЯ МЛЫНА...

*Запісана ў в. Рубель Столінскага раёна*
*ад К. Н. Сівіцкай (1938 г. н.)*
*і М. М. Сцяпанавай (1940 г. н.)*

Там, каля млына, цвіла каліна.
Дзе ж тая дзяўчына, што мяне любіла?
Дзе ж тая дзяўчына, што мяне любіла?

Не так любіла, як шанавала,
Купіла коніка, падаравала.
Купіла коніка, падаравала.

А той канёчак, крывыя ножкі,
Звёў мяне, збіў мяне з пуці-дарожкі.
Звёў мяне, збіў мяне з пуці-дарожкі.

Там, каля млына цвіла каліна.
Дзе ж тая дзяўчына, што мяне любіла?
Дзе ж тая дзяўчына, што мяне любіла?

*Запісала Н. А. Пашкевіч у 2007 г.*

## ГОЛУБ НА ЧАРЭШНІ...

*Запісана ў в. Малыя Канюшыны Лідскага раёна*
*ад Н. І. Хроман (1943 г. н.)*

Голуб на чарэшні, галубка на вішні,
Голуб на чарэшні, галубка на вішні.
Скажы, мой міленькі, што ў цябе за мыслі?
Скажы, мой міленькі, што ў цябе за мыслі?

Ці ў цябе за мыслі міне замуж браці?
Ці ў цябе за мыслі мяне замуж браці?
Ці ў цябе за мыслі мяне пакідаці?
Ці ў цябе за мыслі мяне пакідаці?

А ў маім садочку дарожка крывенька,
А ў маім садочку дарожка крывенька.
Ой, да там хадзіла чорная брывенька,
Ой, да там хадзіла чорная брывенька.

Ох, я нахадзіла, хадзіць больш не будзем,
Ох, я нахадзіла, хадзіць больш не будзем.
Ох, я налюбіла, любіць больш не будзем,
Ох, я налюбіла, любіць больш не будзем.

Ой, каго любіла, таво пазабыла,
Ой, каго любіла, таво пазабыла.
А каво не знала — на ручнічок стала,
А каво не знала — на ручнічок стала.

*Запісала В. А. Кухарская ў 2007 г.*

## ОЙ, ПАЙДУ Я, ВЫЙДУ...

*Запісана на хутары Збляны Лідскага раёна*
*ад М. П. Урбановіч (1941 г. н.)*

Ой, пайду я, выйду,
Выйду ў чыста поля.
Там краса дзяўчына
Лён кудравы поле.

Лён кудравы поля,
Голасна спявае.
Песняю чароўнай
Сэрца закранае.

Ой, пайду я, выйду
Ярам на даліну,
Павяду паволя
Ружую машыну.

Павяду машыну,
За гарою стану,
Паслухаю песню,
На дзяўчыну гляну.

Сонца на заходзі,
Блізка вечарына.
Ой, скажы, кудою
Пойдзеш ты, дзяўчына?

А ці каля рэчкі,
А ці каля гаю,
А ці ля крыніцы?
Завяду дадому цябе, чараўніца.

*Запісалі І. У. Шах*
*і У. Ю. Камінскі ў 2006 г.*

## НЕ СМЕЙСЯ, КОЗАЧЭ...

*Запісана ў в. Туры*
*ад В. П. Каляды (1932 г. н.)*

— Не смейся, козачэ, што я сірота.
Шчоб ты прыйшоў у сваты,
То я й не пошла б.

— Колі ж ты такая, то я не пойду,
Поеду ў Росію, шчэ й усе города,
Поеду ў Росію, шчэ й крашэ найду.

— Проехаў Росію, шчэ й усе города,
Такой не найшоў, як тая сірота.
Проехаў Росію, шчэ й городоў пяць,
Прыехаў до тэбэ, сірота, я опяць.

Прыехаў казачэ ў іе ворота,
Стоіць та сірота засмучоная,
Наверна, сірота заручоная.

— А ўчора з вячора гарэлку пілі,
Да й мойму сярдэньку жалю задалі.

*Запісала Н. У. Дранец у 2001 г.*

## ОЙ, НЕ СВЕЦІЦЬ МЕСЯЧЭНЬКУ...

*Запісана на хутары Збляны Лідскага раёна*
*ад М. П. Урбановіч (1941 г. н.)*

Ой, не свеціць месячэньку
Да й на той пералаз,
Дзе стаялі, казачэньку,
З табой паследні раз.

Ой, аралі хлопцы ніву,
Паламалі ярмо.
— Заплаці ты мне, дзяўчына,
Што я хадзіў даўно.

— А я табе, казачэнька,
Плаціла, плаціла:
Цалаваў мае лічэнька —
Я не пярэчыла.

І пры сонцы, і пры зорцы,
І пры месячыку
Цалаваў маё лічэнька
Мілы казачэнька.

Ой, каб тыя сады завялі,
Што рана расцвілі.
Каб тыя людзі шчасця ні зналі,
Што нас разлучылі.

Ой, аралі хлопцы ніву,
Паламалі ярмо.
Хадзіў-хадзіў да дзяўчыны,
Аказалась — дармо.

*Запісалі І. У. Шах*
*і У. Ю. Камінскі ў 2006 г.*

## ОЙ, ТАМ, КАЛЯ РЭЧКІ...

*Запісана ў в. Магдален*
*ад Г. В. Гуцько (1927 г. н.)*

Ой, там, каля рэчкі,
Ой, там, каля броду
Клікаў казак дзеўку ў нову камору.
Клікаў казак дзеўку ў нову камору.

— Не пойду, казачэ,
Не пойду з табою,
Бо я ж маладая — баюсь нагавору.
Бо я ж маладая — баюсь нагавору.

— Не бойся, дзяўчына,
Не бойся нічога:
Казак маладзенькі не зробіць плахога.
Казак маладзенькі не зробіць плахога.

Не спала я ночку,
Не спала другую.
На трэцюю ночку ўзяла та й заснула.
На трэцюю ночку ўзяла та й заснула.

На трэцюю ночку
Ўзяла та й заснула.
Асмеліўся мілы, а я не пачула.
Асмеліўся мілы, а я не пачула.

Устала я рана,
Як зорачка ўецца.
Ляжыць на краваці мой мілый — смяецца.
Ляжыць на краваці мой мілый — смяецца.

— На табе, дзяўчына,
Сто рублей на піво,
Сто рублей на піво, дзесяць — на мыло.
Сто рублей на піво, дзесяць — на мыло.

Півам напівайся,
А мылам умывайся,
Каб бацька не зведаў і маці не знала.
Каб бацька не зведаў і маці не знала.

Каб бацька не зведаў
І маці не знала,
С кем ты, маладая, всю ноч начавала.
С кем ты, маладая, всю ноч начавала.

А бацька дазнаўся,
І маці пазнала,
С кем маладая всю ноч начавала.
С кем маладая всю ноч начавала.

Цяпер жа ты, доню,
Ні дзеўка, ні жонка,
Цяпер жа ты, доню, людзям пагаворка.
Цяпер жа ты, доню, людзям пагаворка.

*Запісала Д. П. Сідарук у 2006 г.*

## СЯМЕЙНЫЯ ПЕСНІ

### ВЯРБА, ВЯРБА, ДЗЕ ТЫ РАСЛА...

*Запісана ў в. Варонічы Полацкага раёна ад Я. П. Літвінавай (1939 г. н.)*

— Вярба, вярба, дзе ты расла?
Тваё лісцё вада знясла?
Тваё лісцё вада знясла?

А я, малада, замуж пайшла,
Замуж пайшла за пятага,
За п'яніцу праклятага.
За п'яніцу праклятага.

Прапіў каня варанога,
А сам прыйшоў па другога:
— Жана, жана, выкуп каня,
Ня выкупіш — пагібну я.
Ня выкупіш — пагібну я.

— Ня раз, ня два выкупляла,
Шалкову шаль закладала,
Шалкову шаль закладала,
У зялёным саду начавала.
У зялёным саду начавала.

*Запісалі Т. У. Буланава, Д. Д. Качаткова, Т. М. Белая, Л. М. Варабей у 1991 г.*

## ПАЙШЛА МАЛАДА ДЗЕВАЧКА ПА КАНЯ...

*Запісана ў в. Ракавічы Нясвіжскага раёна*
*ад А. І. Быль*

Пайшла малада дзевачка па каня,
Там яе цёмна ночка абняла.
Пад калінаю спаць лягла.
Прыляцела зязюлька, стала кукаваць,
Яе, маладую, стала пабуджаць:
— На каго ж ты, дзевачка, жаль маеш?

— Маю жаль на ўвесь род,
На родную мамачку наўпярод,
Што далей замуж аддала,
Вялікага пасагу не дала,
Не вяліць у госці часта хадзіць.

Стала мая мамка паслы слаць:
— Едзь, маё дзіцятка, у госці к нам.
Уся мая сямейка схмурнела,
Чабаром сцежкі зараслі.
Без цябе таварышкі гуляць к нам не пайшлі.
У хатцы маёй хмурненька,
А мне, старой, трудненька.

*Запісала Т. В. Быль*

## ПРАЛА Б Я КУДЗЕЛЕЧКУ...

*Запісана ў в. Калеяўцы Пастаўскага раёна*
*ад А. В. Лосік (1912 г. н.)*

Прала б я кудзелечку — галоўка баліць,
Пайшла б я ў карчомачку — муж не вяліць.

Да паехаў міленькі ў поле араць,
А я, маладзенькая, у карчомку гуляць.

Да прыехаў міленькі з поля, з арбы,
А я, маладзенька, — з карчомкі, з гульбы.

— А дзетачкі-кветачкі, дзе мамка была?
— А папачка родненькі, у карчомцы піла.

— А дзетачкі-кветачкі, будзем мамку біць?
— А папачка родненькі, хай яна паспіць.

*Запісаў Я. У. Паўлікавы ў 1991 г.*

## КАЛІНА-МАЛІНА,
## ЧАГО Ў ЛУЗЕ ЗВЯЛА?..

*Запісана ў в. Слабада*
*Вілейскага раёна*
*ад Л. І. Сяргей* (*1914 г. н.*)

— Каліна-маліна, чаго ў лузе звяла?
Ці ветру баішся, ці дожджу жадала?
— Ветру не баюся, дожджу не жадаю,
А таго я смутна, што ягод не маю.

— Малада дзяўчынка, чаго скучна ходзіш?
Ці галоўка боліць, ці свет няволіць?
— Галоўка не боліць, мне свет не няволіць,
Ой, таго я смутна, што не даў Бог долі.

Што не даў Бог долі, як маёй радзімцы:
Уся мая радзімка і п’ець, і гуляець,
І п’ець, і гуляець, долечку маець.
А я, маладая, не п’ю, не гуляю,
Не п’ю, не гуляю, бо долі не маю.

Сама маладая, свякроўка ліхая:
Як хлеба ўкрою — ўсё ліха растрою,
Як хлеба ўкушу — заплакаці мушу,
Як хлеб палажу — ліха ўсё абтрушу.

*Запісала А. С. Дубай у 1988 г.*

## БЯРОЗА МАЯ КАРАНІСТАЯ...

*Запісана ў в. Семежава*
*Капыльскага раёна*
*ад В. С. Манак*

Бяроза мая караністая,
Свякроўка мая наравістая.
Пакуль усе норавы не ўзнала,
Не раз і не два не абедала.
На работу скажа,
Сама спаць ляжа:
— А ты, мой сынок, каня напасі.
А ты, нявестка, вады прынясі.

Па ваду ішла, як пчолка, гула.
З вадою ішла — наплакалась.
Учуў мілы мой, каня пасучы:
— Не плач, мілая, ваду несучы.
Каня напасу, вады прынясу,
Табе, маладой, работы змяншу.

*Запісалі Т. Зянько і Н. Куракевіч*

## ХАДЗІЎ, ХАДЗІЎ ЯСЕН МЕСЯЧЫК ПА НЕБУ...

*Запісана ў в. Жыхары*
*Полацкага раёна*
*ад Т. А. Пятровай*

Хадзіў, хадзіў ясен месячык па небу,
Лічыў, лічыў зорачкі на небе,
Не далічыўся, не дасчытаўся зорачкі адной:
— А дзе ж мая зорачка заруець?
А заруець зорачка на небе.

Хадзіў, хадзіў татка па хатцы,
Лічыў, счытаў сямейку ў дому,
Не далічыўся, не дасчытаўся дачушкі:
— А дзе ж мая дачушка гаруець?
А дзе ж яна цёмну ночку начуець?
А гаруець, а служыць маладому малойчыку.

*Запісалі К. Дземідовіч*
*і В. Ігнаценка*

## А Ў ПОЛІ БЯРОЗА СТАЯЛА...

*Запісана ў в. Пархава*
*Лагойскага раёна*
*ад В. П. Карнцэвіч*

А ў полі бяроза стаяла,
Караннём буяла, веццейкам махала.
А гэтай бярозцы салавей-пташка,
Салавей-пташка песні пеў.
— Салавей-пташка, ляці ў той бачок,
Ляці ў той бачок, занясі галасок,

Дзе ацец-маць жывуць.
Раскажы ты ім, як я тут гарую,
На чужой старане, пры ліхой свекрыве.

А ўчора звячорак камора звінела,
А ў той каморы свякроўка сядзела,
Свякроўка сядзела, сыну біць вялела,
І бізун падала, і сама пасцягала,
А сястрыца-заловіца біці не давала:
— А не біце яе, будзе гэта і мне
На чужой старане пры ліхой свекрыве.

*Запісала В. Барысевіч у 1985 г.*

## АДДАЎ МЯНЕ ТАТКА...

*Запісана ў в. Губіна*
*Лепельскага раёна*
*ад А. В. Бяляк*

Аддаў мяне татка,
Ой, замуж далёка.
А сказаў татка
У госці не хадзіць.
Пабыла гадочак,
Была я другой,
А на трэці годзік
Затужылася.
Абярнулася, ой, я
Шэрай зязюляй,
А палячу ж я
У шчырыя бары.

Ой, не пачуець мая мамка,
Печку топячы.
Ой, не пачуець братоўка,
Кароў доячы.
Ой, не пачуець сястрыца,
Сені метучы.
Ой, не пачуець мой татка,
З карчомкі ідучы.
Ажно мой татка
З карчомкі ідзе,
А малодшы брацечка
За руку вядзець.

— А дазволь мне, татка,
Зязюльку забіць.
— Гэта ж не зязюля —
Дачушка мая.
— Калі наша сястрыца,
Ляці к нам на двор,
А калі шэра зязюля,
Ляці ў шчыры бор.

*Запісана ў 1969 г.*

## А ДУБ У ДУБЕ ГАЛОВАЧКУ КЛОНІЦЬ...

*Запісана ў в. Роскі-Сялец*
*Аршанскага раёна*
*ад У. А. Косінец*

А дуб у дубе ды галовачку клоніць.
Цешча пра зяця ў бяседзе гаворыць:
— Ай, узяў дачку красну, як бруснічку,
Шчарніў дачку чорну, як чарнічку.
А ўзяў дачку, як яркае сонца,
А ссушыў дачку суху, як саломка.

А не мог зяць у бяседзе сядзеці,
А пайшоў зяць свае жонкі глядзеці:
— А жана ж мая, наймілейша душа,
Сварылася на мяне твая матачка дужа.
— А муж жа мой, наймілейша душа,
Прасці, прасці маёй матачкі
Ды гэтыя слоўцы.

А ў полі, полі ды каліна алеіць.
Каждая маці дзіцятка жалеіць.
Ай, у полі, полі ды каліна ссыхаіць,
Каждая маці па дзіцятку ўздыхаець.

*Запісала В. Косінец*

## СТАЯЛА АНЕЧКА НА ПАМОСЦЕ...

*Запісана ў в. Нарэйкава*
*Аршанскага раёна*
*ад У. І. Сугак* (*1915 г. н.*)

Стаяла Анечка на памосце,
Ґукала мамачку к сабе ў госці:
— Прыязжай, мамачка, ка мне ў госцейкі.
Як будзеш ехаць каля горада,
Не забудзь заехаць на рыначак.
Не купляй, мамачка, салавеечку,
А прыкуй салавейку к краватачкі.
Салавей раненька шчабятаць будзе,
Нас, маладых, пабуджаць будзе.
А ў мяне цяпер свякроўка — не родная мамка,

Раненька ўстане — нас не ўзбудзе,
Пойдзе за вароты, абсуждаць будзе:
— Брала нявесту за хазяйку,
А ўзяла сабе негадзяйку,
Не хоча рана ўставаці,
Свякроў мамкаю называці.
Не ўмее хазяйства павадзіці,
Не хоча з людзьмі гаварыці.

*Запісала С. Тарасава ў 1978 г.*

## СІРОЦКІЯ І ЎДОВІНЫ ПЕСНІ

### БАЛІЦЬ ЖА МНЕ ГАЛОВАЧКА...
(*сіроцкая песня*)

*Запісана ў в. Пажарцы Пастаўскага раёна ад Н. І. Рэмбальскай* (*1917 г. н.*)

Баліць жа мне галовачка —
Чым яе звязаці?
Чым яе звязаці?

Далёка мая мамка —
Нет каго наслаці,
Нет каго наслаці.

Завяжу я галовачку
Шоўкавым платочкам.
Шоўкавым платочкам.

Пашлю я да мамачкі
Тры сівых галубочка.
Тры сівых галубочка.

Ляці, сівы голуб,
Нідзе не садзіся.
Ніде не садзіся.

Перад маёй роднай мамкай
Нізенька складніся.
Нізенька складніся.

Ляцеў, ляцеў сівы голуб
Сеў вадзіцу піці.
Сеў вадзіцу піці.

А як цяжка мне, мамачка,
Мне без цябе жыці.
Мне без цябе жыці.

А ўслышаў сам Божэнька
З высокага неба.
З высокага неба.

— А што табе, дзяўчынка,
А што табе трэба?
А што табе трэба?

Даў я табе ручкі-ножкі
І чорныя вочкі.
І чорныя вочкі.

Працуй, рабі, дзіцятачка,
Аж да самай ночкі.
Аж да самай ночкі.

— А Божа мой, а міленькі,
Ці я не рабіла?
Ці я не рабіла?

Калі мая работачка
Нікаму не міла.
Нікаму не міла.

*Запісала Т. А. Мацвійчук у 1989 г.*

## САЛАВЕЙКА РАБЕНЬКІ...
(*сіроцкая песня*)

*Запісана ў в. Лозкі Дзятлавіцкага раёна*
*ад Г. В. Краўчанка* (*1924 г. н.*)

Салавейка рабенькі,
Салавейка рабенькі.
Не прылятай ты ка мне,
Не надавай жалю мне,
Бо я ў чужой старане.

Ой, пайду ў лес гукаць,
Свае маманькі шукаць.
Паслухала, не паняла,
Заплакала і пайшла,
Пайшла ў поле
Да свае мамы магілкі.

— Стань, мамка, не ляжы,
Мне работку накажы.
— Трэ было тады вучыцца,
А цяпер я не магу,
Ўгору ручак не ўздыму.

## ПАЙШЛА Я Ў ЛЕС ПА МАЛІНУ...
(*сіроцкая песня*)

*Запісана ў в. Зеляневічы Пружанскага раёна*
*ад Н. К. Бортнік* (*1938 г. н.*)

Пайшла я ў лес па маліну,
Маліны я там не нашла.
Нашла я там крэст і магілу,
Катора травой зарасла.
Нашла я там крэст і магілу,
Катора травой зарасла.

Нашла я там крэст і магілу,
Катора травой зарасла.
Упала я там на калені
І горка рыдаць начала.
Упала я там на калені
І горка рыдаць начала.

— Мамаша, ты спіш і не слышаш,
Як плача сіротка твая.
Мамаша, ты спіш і не слышаш,
Як плача сіротка твая.

І голас з магілы раздаўся:
— Не плач ты, сіротка мая!
Вазьмуць цябе людзі чужыя
І будуць ласкаць і вучыць.
Вазьмуць цябе людзі чужыя
І будуць ласкаць і вучыць.

— Не нада мне іхняе ласкі,
Не нада мне іх разгавор,
А нада мне маміна ласка
І папін вясёл разгавор.
А нада мне маміна ласка,
І папін вясёл разгавор.

*Запісала А. І. Путырская ў 2006 г.*

## ОЙ, У САДУ ПРЫ ДАЛІНЕ...
(*сіроцкая песня*)

*Запісана ў в. Фядоры Столінскага раёна*
*ад М. К. Гунько* (*1922 г. н.*)

Ой, у саду пры даліне
Громко пое соловей,
А я, мальчык на чужыне,
Позабыв усіх друзей.

Позабыв я, позабросів
З молодых і юных лет.
Сіротою я оставса,
Шчасця-долі в меня нет.

Куда ж я не поеду,
Куда ж я не пойду,
Я токое размовонькі
Нідэ собе не знайду.

Ой, умру я, умру,
Похороняць меня,
А родныя не ўзнаюць,
Дзе могіла моя.

Да на мою могілу
Да ніхто ж не прыйдзёт,
Только раннёю порою
Салавей песню споёць.

Салавей ты, салавеюшка,
Чо ты рано споёш?
Ой, ты хлопцу молодому
Ты спокою не даёш.

*Запісала В. І. Палукошка ў 2002 г.*

## АДДАЎ МЯНЕ ТАТАЧКА ЗАМУЖ ДАЛЯКО...
(*сіроцкая песня*)

Аддаў мяне татачка замуж даляко,
Прыказаў мне татачка сем лет не бываць.

Не была я годзічак, не была ж я два,
А на трэці годзічак засмуцілася,
Мне да мамкі ў госцікі захацелася.

Пайшла б я пеша — знаю: не дайду.
Папрасіла б коніка — знаю: не дадуць.

Скінуся зязюлькаю, палячу я ў сад,
Сяду я на ябланьку, буду кукаваць.

Можа, ўчуе мамачка, печы палячы.
Ой, не ўчула мамачка, печы палячы.

Можа, ўчуе сёстранька, сені метучы.
Ой, не ўчула сёстранька, сені метучы.

Можа, ўчуе брацейко, коні поючы.
Ой, не ўчуў жа брацейко, коні поючы.

Можа, ўчуе татачка, да свірна ідучы.
Ой, учуў жа татачка, да свірна ідучы:

— Калі сіва зязюлька, то ляці ў бор,
Калі родна дочачка, то ідзі за стол.

Ой, прыйшла ж я ў хатаньку,
Добры дзень дала.
Ці жыва-здарова ўся мая радня?

— Ой, жыва-здарова ўся твая радня,

Толькі роднай мамачкі на свеце няма.
— Не хачу я, татачка, твае чэсці знаць.
Пайду на магілачку мамачкі шукаць.

Адчыніся, трунaчка, трунaчка дубовая,
Адзавіся, мамачка, мамачка родная.

Трунaчка дубовая не адчынілася,
Мамачка родная не адазвалася.

## ВЫЙДУ Я НА ГОРКУ...
(*сіроцкая песня*)

*Запісана ў в. Фядоры*
*Столінскага раёна*
*ад Д. Д. Туцкай (1917 г. н.)*

Выйду я на горку,
На горку крутую.
Стану, подывлюса
В сторонку родную.
Стану, подывлюса,
Скуля тэплы віцер вые.
То моя мамонька
По мні мліе.

Пойду я на горку,
З горкі — дадому.
Хочацца мні, бідной,
Іхаці дадому.
Стану я на кладку —
Та кладка гнэцца.
Умэр бацька, ўмерла матэр —
Гостына мінецца*.

Зойду я на горку,
На горку крутую,
Огорнуло мэнэ ліхо,
Мэнэ молодую.

*Запісала В. І. Палукошка ў 2002 г.*

## ГОСПАДЗЬ БОГ...
(*сіроцкая песня*)

*Запісана ў в. Зеляневічы*
*Пружанскага раёна*
*ад М. М. Варабей (1940 г. н.)*

Госпадзь Бог, Госпадзь Бог па небе ходзіць,
А за ім ангелікі ключы носяць.
Як твая сіротка слёзна плачыць.
А ў цябе, Божанька, долю просіць.
Першая доленька — здароўеўка,
Другая доленька — падружанька,
Трэцяя доленька — замужжа.

*Запісала А. І. Путырская ў 2006 г.*

---

**Гостына мінецца — «нэма до кого іхаты, нэ будзе іхаты ў госці»* (заўвага выканаўцы).

## ОЙ, С-ПОД ГОРЫ ЦІХІЙ ВЭТЭР ВІЕ...
(*удовіна песня*)

*Запісана ў в. Тышкавічы*
*Іванаўскага раёна*
*ад М. А. Бондар* (*1913 г. н.*)

Ой, с-под горы ціхій вітэр віе,
Ой, там вдовіца пшэнічэньку сіе,
А пасіяўшы, начала волочыты,
А паволочыўшы, стала Бога просіты:
— Вой, на ж мэнэ, бідную удовіцу,
Зароды, Божэ, да густую пшэніцу.

Шчэ й удова да дому нэ зайшла,
А ужэ удовіна пшэнічанька узыйшла.
Шчэ й удова да на лаўку нэ сіла,
Да й шчэ удовіна пшэныца поспіла.

А ужэ вывыла пэрэпілочка дыты,
Пошла вдова пшэніцу глэдыты.
— Дыты моі, дыты, дэ ж вас подыты?
Чым мнэ вас, дыты,
У велькі шлях пусціты?
— Маты наша, маты, да нэ лякайся з намы,
Як мы порастэмо, ды й разайдэмося самы.

*Запісана ў 1987 г.*

## ДЫ ГУЛА ПЧОЛКА, ГУЛА...
(*удовіна песня*)

*Запісана ў в. Залессе*
*Верхнядзвінскага раёна*

Ды гула пчолка, гула,
На бары лётаючы
Ды мядок збіраючы.
— Горкі мой мядочку
Ды без цябе, бортнічку, —
Ды плакала ўдовачка,
Ды на двары ходзячы,
Ды дроўцы збіраючы,
Ды абед гатуючы:
— Ды без цябе, мой міленькі,

Сама сяду на покуце,
А дзеткамі абсаджуся,
Слёзкамі абаллюся.
Дзеткі ж мае маленькія,
Слёзкі мае драбненькія,
Дзеткі мае набольшалі,
Слёзкі мае нагоршалі.

*Запісалі І. Каўзуновіч,*
*Л. Рудак, Л. Мацюгюнак*

## КУКАВАЛА ЗЯЗЮЛЕЧКА...
(*удовіна песня*)

*Запісана ў в. Каладзіно Уздзенскага раёна*
*ад Н. С. Зуй*

Кукавала зязюлечка,
Па барыку лятаючы,
Па барыку лятаючы,
Салавейку шукаючы.
Да плакала ўдовачка,
Сыры дровы рубаючы,
Сыры дровы рубаючы,
Горкі абед гатуючы,
Горкі абед гатуючы,
Дробны дзеткі гадуючы.

*Запісалі А. Берасцевіч,*
*А. Кірэй, Т. Іваноўская*

## АЙ, ШЛІ-ПРАЙШЛІ КАЗАКІ З ВАЙНЫ...
(*удовіна песня*)

*Запісана ў в. Цяхцін Бялыніцкага раёна*
*ад А. М. Крамко* (*1919 г. н.*)

Ай, шлі-прайшлі казакі з вайны,
Ай, шлі-прайшлі казакі з вайны,
Заблудзілі к удаве па начы,
Заблудзілі к удаве па начы.
— Удовушка маладая,
Удовушка маладая,
Пусці ночку начуваці,
Пусці ночку начуваці.
— У мяне ні плеці, ні павеці,
У мяне ні плеці, ні павеці,
Нейдзе вашым коням стаці,
Нейдзе вашым коням стаці,
Нейдзе шынялі пахаваці,

Нейдзе шынялі пахаваці,
А ў мяне дроў ні палена,
А ў мяне дроў ні палена,
Мае сені някрытыя,
Мае сені някрытыя,
Мая печка не топлена,
Мая печка не топлена,
Мае дзеці есці плачуць,
Мае дзеці есці плачуць.
— Мы сваіх каней прывяжам,
Мы сваіх каней прывяжам,
На вуліцы пахаваем,
На вуліцы пахаваем,
Мы твае сені пакрыем,
Мы твае сені пакрыем
Сваімі шынялямі,
Сваімі шынялямі.
Мы табе дроў нарубаем,
Мы табе дроў нарубаем.
А сваімі сухарамі,
А сваімі сухарамі
Мы тваіх дзетак накормім,
Мы тваіх дзетак накормім.
Дурна, дурна, ўдовушка,
Дурна, дурна, ўдовушка:
Свайго мужа не ўгадала,
Свайго мужа не ўгадала,
Дзецям бацьку не ўказала,
Дзецям бацьку не ўказала.

*Запісала С. І. Сумко ў 1991 г.*

## ЯК Я БАГАТА БЫВАЛА...
(*удовіна песня*)

*Запісана ў в. Янковічы Расонскага раёна*
*ад К. І. Пазняковай* (*1913 г. н.*)
*і Н. В. Заемна* (*1912 г. н.*)

Як я багатай бывала,
Як я багатай бывала,
Тады мяне ўся радня знала,
Тады мяне ўся радня знала.
Чэраз мой двор дарожанька ляжала,
Чэраз мой двор дарожанька ляжала.

А як я заўдавела,
А як я заўдавела,
Тады мяне гора адалела,
Тады мяне гора адалела.
Чэраз мой двор дарожкі не стала,
Чэраз мой двор дарожкі не стала.
Тады мяне радзіма не знала,
Тады мяне радзіма не знала.
А як мяне худобанька ўбіла,
А як мяне худобанька ўбіла,
Тады мяне радзіма забыла,
Тады мяне радзіма забыла.

*Запісалі А. У. Піваварчык*
*і Л. Т. Палазнік у 1985 г.*

## ДА МАЛАДА ЎДАВА...
(*удовіна песня*)

*Запісана ў в. Забалоцце Мазырскага раёна*
*ад К. П. Каножыч* (*1905 г. н.*)

Да малада ўдава
З новага двара
Да сівага вала ўзганяла.
Едзе казак малады
На сівым кане
Да ўдаву сустракае:
— Гур табе, ўдава, гур,
Як ты мяне ўспадабала,
Люблю я цябе,
Ўзяў бы да сябе,
Ды толькі дзяцей ў цябе многа.
— Гур табе, вража,
Хто табе кажа,
Што ў мяне дзяцей многа?
Тры сыны арэ, а тры барануе,
А дзевяць дачок постаць гоняць,
А пяць зяцёў-саханоў
Ка мне ў госці ходзяць.
— Ды параблю сеці
На твае дзеці
І буду іх лавіці,
А куплю нагайку

На цябе, каханку,
І буду цябе біці.
— Не рабі сеці
На мае дзеці,
Бо не будзеш іх лавіці,
А запрагай каня,
Уезжай з двара —
Ты не мой, я не твая.

*Запісалі Л. Т. Андрэева, Н. Н. Аціпава*
*і М. П. Астапава ў 1975 г.*

## ПАМЁР, ПАМЁР НАШ ХАЗЯІН...
(*удовіна песня*)

*Запісана ў в. Вялікі Рожан Салігорскага раёна*
*ад А. Р. Бобрык* (*1914 г. н.*)

Памёр, памёр наш хазяін,
З паходу ідучы.
Засталася ўдовушка
З малымі дзяцьмі.
— Ой вы, дзеці мае, дзеці,
Што з вамі рабіць?
Адзін кажа: — Маманька,
Пайду я служыць.
Другі кажа: — Не йдзі, братка,
Бо цяжка рабіць.
Трэці кажа: — Маманька,
Паеду ў Растоў.
Пахаваю свайго атца
У вішнёвым саду,
Ды й высыплю магілачку
З жоўтага пяску,
Ды й пасаджу цярэшанку
Тонку, высоку,
Ой, тонку, высоку, лістам шыроку.
Нельзя, нельзя з цярэшынкі
Лісточка сарваць
Нельзя, нельзя дзяўчоначкі
Заручонай браць.
Адзін вядзе за ручаньку,
Другой за рукаў,
Трэці стаіць, сэрца баліць:
Любіў, да не ўзяў.

*Запісалі І. Голас і Н. Маркоўская ў 1981 г.*

## ЗА ГАРОЮ, ЗА КРАМЯНОЮ...
(*удовіна песня*)

*Запісана ў в. Баяры*
*Маладзечанскага раёна*
*ад Г. П. Сокал (1923 г. н.)*

За гарою, за крамяною малада ўдоўка плача.
— Не плач, ўдоўка, бедна галоўка,
Ужо твой татачка едзе.
— Няхай едзе, няхай заязджае:
Не маю саду, ні вінаграду, дзе яго коні дзецi,
Не маю я слоўца міленькага, каб з ім гаварыцi.

За гарою, за крамяною малада ўдоўка плача.
— Не плач, ўдоўка, бедна галоўка,
Ужо твой міленькі едзе.
— Во няхай едзе, хай заязджае на маё падвор'ейка:
Я маю саду і вінаграду, дзе яго коні дзецi,
Я маю слоўка міленькае, буду з ім гаварыцi.

*Запісала Г. В. Сокал у 1985 г.*

## ЯК Я БЫЛА СЕМ ЛЕТ ЎДАВОЮ...
(*удовіна песня*)

*Запісана ў в. Хардакова*
*Пастаўскага раёна*
*ад А. І. Балай (1929 г. н.)*

Як я была сем лет ўдавою,
Дык я не чула ножак пад сабою.
А як я стала свайго мужа меці,
Дык мне жа стала галоўка балеці.
— Ой, пампу, мілы, пампу, пампу,
Ой, зрабі, мілы, з паперачкі труну.
— А дзе ж я буду паперачку браць?
Будзеш, мілая, у сасновай ляжаць.
— Пасадзі, мілы, на магіле каліну,
Як прыйдуць дзеткі каліну рваці,
Дык будуць дзеткі ўсю праўду знаці.

*Запісала Л. Гарбаленя ў 1991 г.*

## ПРЫМАЦКІЯ ПЕСНІ

### ТЫ ВІШЭНКО-ЧЕРЭШЭНКО...

*Запісана ў в. Ліплёўка Брэсцкага раёна*
*ад С. К. Струк*

Ты вішэнко-черэшэнко,
Чаму ягод не маеш?
Хто ў прымах не бувае,
Той гора не знае.

А я сэбэ, молодэнькі,
Усе горюшко знаю:
Кулачэнько под головенько —
Той спаць легаю.

Моя тэшча, еі маты,
Ідэ пробуджаты:
— Вставай, зэцю,
Годэ спаты,
Ідь в поле гораты.

А зэць волы запрагае,
Він думку мае,
Він думку всё думае,
Шчо він волі не мае.

Заехав він в поле
І давай гораты.
Горав він, горав долынаю.
Ой, з хутару зяцю відаты.

Все жінкі обід нэсуць,
А моей не відаты.
Схоців зяць обедаці,
Він волы запрагае
І до дому ад'язжае.

А заіхав зяць до дому,
Волов распрагае,
А ему цішча обід налівае:
То з двух місок, то з трох місок
Ему вылівае.

Увайшоў зіць до хаты,
А яго цішча ему кажа:
— Несі свінкам істы.

— Ой, шчоб свінкі поздыхалі,
Шчоб луга згорылы,
Як мне тая прімакова
Жізнь й надаела!

*Запісала Т. Буганова*

### ВІШАНЬКА-ЧАРЭШАНЬКА...

*Запісана ў в. Тажылавічы Бабруйскага раёна*
*ад В. П. Мілічонак (1916 г. н.)*

Вішанька-чарэшанька
А ягад не мае.
Хто ў прымах не бывае,
Той гора не знае.

Арэ прымак, арэ прымак,
Угору паглядае:
Усе жоны абед нясуць,
А маю чорт не мае.

Едзе прымак, едзе прымак,
У дудачку свішча:
—Хавай, Маня, варэнне,
Едзе прымачышча.

Не ўспеў прымак
На лавачку сесці,
Як яго цёшча заставіла
Свінням несці.

— А штоб свіння здохлі
Да цёшча згарэла,
Як мне эта прымацкая
Жызня надаела!

*Запісала Т. В. Сакавей у 1993 г.*

## ЭЛЕГІЧНЫЯ ПЕСНІ

### ОЙ, ВОСЕНЬ МАЯ...

*Запісана ў г. п. Гудагай Астравецкага раёна ад К. Я. Замара (1939 г. н.)*

Ой, восень мая,
Восень сцюдзёная,
Чаго ты рана захаладала?
— Я й не раненька,
Я й не позненька, —
Калі мая пара прыйшла.
Лісточак апаў, зямельку ўслаў, —
Вось мая і пара прыйшла.
Рэчкі сталі, пазамярзалі —
Во мая і другая пара.

*Запісала А. Г. Врублеўская ў 1995 г.*

### ОЙ, ТАМ, НА ГАРЫ...

*Запісана ў в. Бярдовічы Слонімскага раёна ад Н. Раўгач*

Ой, там, на гары,
Ой, там, на крутой,
Сядзела там пара сізых галубоў,
Сядзела там пара сізых галубоў.

Сядзелі яны, любаваліся,
Сезымі крыламі абдымаліся,
Сезымі крыламі абдымаліся.
Зкуль узяўся стралец з-пад крутой гары,
Разбіў, разлучыў пару галубоў
Разбіў, разлучыў пару галубоў.

Ён голуба ўбіў, галубку злавіў,
Узяў пад праву руку, прынёс дадому,
Узяў пад праву руку, прынёс дадому.

Прынёс дадому, пусціў да долу,
Насыпаў пшанца аж пад каленца,
Насыпаў пшанца аж пад каленца.

Наліў вадзіцы аж пад крыліцы.
Галубка ні есць, галубка ні п'е,
А на круту гору ўсё плакаць ідзе,
А на круту гору ўсё плакаць ідзе.

— Галубка мая, сізовенькая,
Чаму ж ты такая клапатлівая?
Чаму ж ты такая клапатлівая?

— А як жа мне жыць, клапатлівай не быць:
Як нас была пара — цяпер я адна
Як нас была пара — цяпер я адна.

— Ёсць у мяне семсот галубоў,
Лятай выбіраць — адзін будзе твой,
Лятай выбіраць — адзін будзе твой.

— Сколь я ні лятала, сколь ні выбірала,
Такога не нашла, як я згубіла.
Такога не нашла, як я згубіла

*Запісала А. У. Сямёнава ў 1998 г.*

## УЗЫШОЎ СВЕЦЕЛ МЕСЯЧЫК...

*Запісана ў в. Пагарэльцы Нясвіжскага раёна ад Н. І. Александровіч* (*1924 г. н.*)

Узышоў свецел месячык,
Ясна зара,
Асвяціў дарожаньку
Цёмнага сяла.
Была ж ты, дарожанька,
Непрагляднаю,
Стала ж ты, дарожанька,
Ненагляднаю.

Шыроку дарожаньку
Месяц пралажыў, —
Пракладку дарожанькі
Мілы завяршыў.

*Запісала Г. М. Мякіннік у 2007 г.*

## ПА-НАД ЛУГАМ, ПА-НАД ГАЕМ

*Запісана ў в. Асава Воранаўскага раёна ад В. У. Захарка (1948 г. н.)*

Па-над лугам, па-над гаем
Галубы лятаюць.
Не зазнала я раскошы,
А гады мінаюць.
Не зазнала я раскошы,
Ладна не хадзіла,
Толькі буду ўспамінаці,
Як цяжка рабіла.
Запрагайце, хлопцы,
Коні вараныя,
Ды паедзем даганяці
Годы маладыя.

*Запісала А. В. Герасімчык у 2008 г.*

## ПАЙДУ Я, ГУКАЮЧЫ...

*Запісана ў в. Жарабковічы Ляхавіцкага раёна ад В. К. Палуян (1934 г. н.)*

Пайду я, гукаючы,
Сваю долю шукаючы:
— Ой, ты доля, мая доля,
Дзе ты падзелася?
Ці ў лесе заблудзілась?
Ці ў моры ўтапілась?
— Каб я ў лесе заблудзілась,
Увесь бы лес я засмуціла.
Каб я ў моры ўтанула,
Усё бы мора ўскалыхнула, —
Адзыўнулась мая доля
На той бок сіньма мора.

*Запісала Г. С. Кузняцова ў 2000 г.*

## ЧАМУ Ж ТЫ, ЯЛІНАЧКА, НЕ ЗЯЛЁНА...

*Запісана ў в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна ад Г. І. Дземідовіч (1914 г. н.)*

— Чаму ж ты, ялінка, не зялёна,
Не зялёна?
— Ды як жа мне, яліначцы, зялёнай быць,
Зялёнай быць?
Пада мной два купчыкі начавалі,
Начавалі.
Яны ж маё карэннейка патапталі,
Патапталі.
Яны ж мае ветачкі паламалі,
Паламалі.
Ды па бітай дарожцы раскідалі,
Раскідалі.

*Запісаў А. А. Дубадзелаў у 1988 г.*

## ОЙ, ПАЛЫН МОЙ, ПАЛЫНОЧАК...

*Запісана ў в. Каменічы*
*Асіповіцкага раёна*
*ад В. М. Міхадзюк (1950 г. н.)*

Ой, палын мой, палыночак,
Палын горкая трава,
Гарчэй цябе, палыночак,
Ва ўсім свеце няма.

Ой, ты доля, мая доля,
Доля горкая мая,
Гарчэй цябе, мая доля,
Ва ўсім свеце няма.

*Запісала Т. С. Елісеева*

## ЗАПРАГУ Я СВАЕ КОНІ...

*Запісана ў в. Сялец Мсціслаўскага раёна*
*ад Н. Л. Краўцовай (1931 г. н.),*
*М. Ц. Яжовай (1928 г. н.),*
*Р. В. Івановай (1936 г. н.)*

Запрагу я свае коні,
Коні вараныя,
Ды паеду даганяці
Годы маладыя.
Ды паеду даганяці
Годы маладыя.

Як дагнаў я свае годы
На кляновым мосце.
— Вярніцеся, мае годы,
Да мяне ў госці.
Вярніцеся, мае годы,
Да мяне ў госці.

— Як жа нам ды вярнуціся
Да цябе ў госці?
Трэба было шанаваці
Нас із маладосці.
Трэба было шанаваці
Нас із маладосці.

За палямі, за лясамі
Галубы лятаюць,
Не пазнаў я раскашэнькі
Ды гады мінаюць
Не пазнаў я раскашэнькі,
Ды гады мінаюць.

Запрагу я свае коні,
Коні вараныя,
Ды паеду даганяці
Годы маладыя.
Ды паеду даганяці
Годы маладыя.

*Запісала В. С. Арлова ў 2006 г.*

ЛЯЦЕЛА ЗЯЗЮЛЯ...

*Запісана ў в. Каралёва Уздзенскага раёна ад Р. П. Голышавай (1933 г. н.)*

Ляцела зязюля
Цераз маю хату.
Села на калену
Да і стала куваці.

*Прыпеў*:
Села на калену
Да і стала куваці.

— Чаго, зязюленька,
Чаго рана куеш?
Ці ты, зязюленька,
Май гора чуеш?

*Прыпеў*:
Ці ты, зязюленька,
Май гора чуеш?

— Каб жа я не чула,
Я ж бы не кувала,
Табе, маладзенькай,
Праўды не казала.

*Запісалі Я. М. Кацуба і К. С. Скорына ў 2009 г.*

# II. САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЕСНІ

Студэнту-практыканту, дзеля таго каб вызначыцца з жанрава-відавой прыналежнасцю запісаных твораў, трэба ведаць, што да сацыяльных песень даследчыкі адносяць розныя творы. Н. С. Гілевіч лічыць, што асноўны пласт сацыяльнай лірыкі складаюць песні *разбойніцкія*, *арыштанцкія*, *чумацкія*, *бурлацкія*, *песні адыходнікаў*, *панскіх парабкаў*, *рабочыя* [27]. І. К. Цішчанка разглядаў *рэкруцкія*, *бурлацкія*, *чумацкія*, *рабочыя* і іншыя песні [36]. Г. А. Пяроўская вылучае песні *рэкруцкія*, *салдацкія*, *антыпрыгонніцкія*, *чумацкія і бурлацкія*, *батрацкія*, *казацкія і некаторых іншых сацыяльных груп* [15, 40].

**Парада.** Улічваючы «калейдаскоп» назваў, студэнту-практыканту трэба прытрымлівацца адзінага падыходу:

1) сацыяльная песня — асобны песенны від, які вызначаецца па тыпу адлюстраванага канфлікту;
2) тып канфлікту — сацыяльны;
3) сацыяльныя песні падзяляюцца на розныя тэматычныя групы (у залежнасці ад таго, які герой у іх прадстаўлены).

Вылучаючы *антыпрыгонніцкія* песні, даследчыкі лічаць, што іх галоўнай мастацкай рысай з'яўляецца заклік да расправы з прыгняталь-

нікамі. Але тэма актыўнага сацыяльнага пратэсту раскрываецца і ў некаторых песнях земляробчага календара, асабліва ў жніўных.

**Парада.** Хоць антыпрыгонніцкія песні амаль не захаваліся ў фальклорнай спадчыне беларусаў, улічыце, што цэнтральным з'яўляецца вобраз прыгнятаемага, галоднага селяніна. Для гэтай групы песень таксама характэрны сціплыя, «эканомныя» мастацкія сродкі, простыя эпітэты і параўнанні («Няма хлеба, пане браце, // Ні ў полі, ні дома...»).

*Рэкруцкія і салдацкія* песні даследчыкі аб'ядноўваюць у адну групу, сцвярджаючы, што ім уласцівы агульныя тэмы развітання з бацькоўскім домам, нялёгкай службы ў войску, адмаўлення і асуджэння вайны, ідучы на якую «малойчыкі заплакалі».

**Парада.** Вылучаючы рэкруцкія і салдацкія песні, звяртайце ўвагу на наяўнасць малюнкаў-апісанняў самога набору ў рэкруты ці салдаты (як «круцілі рукі», «ставілі ў ставец» і «везлі на казённы двор») і далейшую цяжкую долю: муштра, суровыя паходы, жыццё ў казармах, здзекі камандзіраў.

Галоўным для беларускіх *казацкіх* песень з'яўляецца шырокае тэматычнае кола, у якім вылучаюцца наступныя групы: адыход казака на службу і вайну; развітанне казака з жонкай, маці, нявестай; казак у бітвах; вяртанне або смерць казака на полі бою. Казацкія песні насычаны багатай сімволікай, псіхалагічнымі паралелізмамі, гіпербаламі, своеасаблівымі меладычнымі ўпрыгажэннямі.

**Парада.** Пры ідэнтыфікацыі казацкіх песень звяртайце ўвагу на наяўнасць выклічнікаў «Гэй!», «Эй!», якія звычайна перарываюць песенную страфу.

Уласна *разбойніцкіх* песень у беларускім фальклоры зусім мала, і тыя ў пераважнай большасці з'яўляюцца варыянтамі характэрных для рускай народнай творчасці песень пра ўдалых малайцоў, верных сяброў «цёмнай ночанькі» ды «зялёнай дубровушкі». Разбойнікамі, мяркуючы па песнях, нярэдка станавіліся хлопцы, якія ўцякалі ад рэкрутчыны і хаваліся ў лясах: «А дзе тры — ўцяклі, у разбойнічкі пайшлі». Да разбойніцкіх песень Н. С. Гілевіч далучае *арыштанцкія*, аб'яднаныя адным героем-разбойнікам, які трапіў у астрог. Асноўнай тэмай гэтых твораў з'яўляецца туга малайца ў астрозе па волі-волюшцы і нараканне на свой горкі лёс («Я па волюшцы гуляў — у астрог каменны папаў»).

**Парада.** Пры вылучэнні разбойніцкіх і арыштанцкіх песень звяртайце ўвагу на асаблівасці прэзентацыі галоўнага героя: у песнях ён заўсёды называецца «беленькі малойчык», які ці «свішча на волюшцы», ці «тужыць у залатой клетачцы».

Калі звярнуцца да *чумацкіх песень*, трэба адзначыць, што яны перасталі сустракацца ў жывым бытаванні, хоць, магчыма, беларускія інфарманты яшчэ іх памятаюць. Тэматыка гэтых песень нязменная: гэта зборы чумакоў ў дарогу, чумацкі побыт, нападзенні ворагаў, вяртанне дадому, узаемаадносіны з сям'ёй, каханай дзяўчынай і нават гібель чумака на чужыне.

**Парада.** Звярніце ўвагу на яскравы і каларытны вобраз чумака: з аднаго боку, гэта абяздолены, бяспраўны працаўнік, вымушаны пераносіць голад, холад, небяспеку, хваробы ў час нялёгкай працы, з другога — моцны, смелы, мужны чалавек, здольны пастаяць за сябе, з пачуццём аптымізму.

Каб пазбегнуць тэрміналагічнай блытаніны, лічым неабходным аб'яднаць *бурлацкія*, *батрацкія* песні, песні *адыходнікаў і панскіх парабкаў* у адну тэматычную групу — **найміцкія песні**. Справа ў тым, што бурлакамі на Беларусі называлі не толькі тых сялян, што наймаліся цягаць уверх па рацэ баржы, але і панскіх парабкаў, батракоў, пастухоў і іншых абяздоленых «наймікаў», якія працавалі на багача ў вёсцы: «Ты бурлача, ты батрача, без вячэры спаць лажыся... // Яшчэ наймік не разуўся — а багач ужо прачнуўся, // Яшчэ наймік не паслаўся — а багач ужо праспаўся». Агульным з'яўляецца тэматычнае кола песень: гэта заўсёды скарга на лёс і папрокі маці за тое, што яна надзяліла такою доляй («...нашто мяне нарадзіла — за бурлака ахрысціла»). У некаторых творах праявіўся выразны сацыяльны пратэст і нават заклік да актыўнай барацьбы: «Мы збярэмся, хлопцы жвавыя, // На расправы на крывавыя, // На расправы — пажарышчамі, // Ад маёнткаў — папялішчамі». З мастацкіх сродкаў у песнях выкарыстоўваюцца розныя паралелізмы, іншых жа паэтычных формул, сімволікі, метафарычнасці і г. д. стваральнікі гэтых твораў пазбягалі.

**Парада.** Памятайце, што ў найміцкіх песнях амаль заўсёды канкрэтна называюцца іх героі: бурлак, батрак, парабак, пастух і іншыя.

*Метадычныя рэкамендацыі.* Пры вызначэнні сацыяльных песень звярніце ўвагу на фармальныя прыкметы гэтых твораў: 1) прамое ўказанне на сацыяльную прыналежнасць герояў песень: сялян, казакоў, рэкрутаў, салдат, чумакоў і іншых; 2) багатая сацыяльная напоўненасць вобразаў; 3) узгадванне сацыяльнага асяроддзя, у якім дзейнічаюць героі.

Практыканту вельмі дапаможа том «Сацыяльна-бытавыя песні» (укладанне, сістэматызацыя тэкстаў і ўступны артыкул І. К. Цішчанкі і інш.), які выйшаў у 1987 г. у Зводзе БНТ, а таксама том «Пазаабрадавая паэзія» (аўтары: А. І. Гурскі, Г. А. Пятроўская, Л. М. Салавей), які з'явіўся ў 2002 г. у серыі «Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка» (Кн. 3.). Сёння не выпадае зафіксаваць шмат антыпрыгонніцкіх, рэкруцкіх, чу-

мацкіх і найміцкіх песень. Фактычна гэтыя творы ўтвараюць класічны, але малапрадуктыўны ў плане функцыянавання фонд сацыяльных песень. Магчыма, студэнту-практыканту пашчасціць запісаць казацкія, салдацкія песні. Звярніце ўвагу на неабходнасць фіксацыі толькі яркіх, выразных, эстэтычна вартых твораў, якія карыстаюцца папулярнасцю.

## АНТЫПРЫГОННІЦКІЯ ПЕСНІ

### УЗЯЛА СЕРПА...

*Запісана ў в. Жужаль Клецкага раёна*
*ад В. Аляксейчык*

Узяла серпа,
Пайшла на палетак,
Забрала з сабою
Сваіх малых дзетак.

Сонейко свеціць,
Пташачкі шчабечуць,
Мае малыя дзеткі
Ўжэ есці хочуць.

Не магу я дзеткам
Да естачкі даці —
Трэба да заходу
Жыцейко дажаці.

Жыцейко жала,
Слязьмі палівала,
Як ішла дадому,
Горко плакала.

Не дай бог вам, дзеткі,
Гэтакае долі:
Увесь век прападаці
Да на панскім полі.

*Запісала Г. Козел*

### ДУБ-ДУБОЧАК...

*Запісана ў в. Мікалаеўшчына*
*Стаўбцоўскага раёна*
*ад С. Бірулі*

Дуб-дубочак,
Дубок маладзенькі,
Майго галубочка
Павялі на здзекі.

А я буду плакаць,
Слёзы ліць,
А паны яго там
Будуць біць.

Павялі ў цямніцу
Пад бізуны,
Каб ачысціць душу
Ад сатаны.

Будуць біць, смяяцца,
Катаваць.
Ад слёз удзяржацца
Не здолее маць.

Пабягу я к ветру,
Папрашу,
Каб ў папоў гэтых
Памякчыў душу.

Сонца маё, сонца,
Ты развей жуду,
Я цябе ў ваконца,
Міленькі мой, жду.

*Запісаў А. Камароўскі*

## ОХ, ТЫ, ДОЛЯ МАЯ, ДОЛЕЧКА...

*Запісана ў в. Чырвоная Слабада Салігорскага раёна ад П. С. Кулеш (1913 г. н.)*

Ох, ты, доля наша, долечка,
Агарнула нас жа горачка,
З-за чаго жа мы так мучымся,
А нідзе мы не навучымся.
Йдзем да пана мы да сонейка,
А прыходзім у ноч позненька.
На каго ж мы так стараемся,
Да зямелькі прыгінаемся?

Забалелі ўжо ў нас ручачкі,
З-за чаго жа нас так катуюць,
Нашу душачку выматваюць.
Ці мы пану запраданыя,
Ці навек яму адданыя?

Ды калі ж мы дачакаемся,
Ды з панамі паквітаемся,
Ды з панамі пазмагаемся,
Ой, за долю за шчаслівую сваю?

*Запісала В. А. Ляшчынская ў 1996 г.*

## А Ў БАРЫ ЗЯЗЮЛЯ КУКУЕ...

*Запісана ў в. Чырвоная Слабада Салігорскага раёна ад В. П. Сплендзер (1948 г. н.)*

А ў бары зязюля кукуе,
Мой сыночак на полі начуе,
Сырую зямельку ён арэ,
На худыя шчочкі слёзы лье.

А заўтра да сонца рана
Трэба ехаць араць на пана.
Ах, мая галованька бедная,
Ах, маё горанька горкае.

Што ж мне заўтра раненька ды зварыць,
Чым жа мне сынка свайго накарміць?
Накармлю сыночка лебядою,
Пасалю я лебяду сваёю слязою.

— Еш, мой даражэнькі, ды спяшы,
А то прыганяты ўжо бяжыць.
Каб нашаму пану трасца ў бок,
Як ён цябе сушыць, мой сынок.

*Запісала В. А. Ляшчынская ў 1996 г.*

## БАДАЙ, ПАНУ Ў ДВАРЫ СТРАШНА...

*Запісана ў в. Чырвоная Слабада Салігорскага раёна ад В. П. Сплендзер (1948 г. н.)*

Бадай, пану ў двары страшна,
Як нам ў полі сонца зайшла.
Сонца зайшла, а мы жнём,
Пры месяцы снопы носім,
Пры зорах у копы кладзём,
Апоўначы дадому ідзём,
На світанні вячэраем,
А ўдзень белы зноў ідзём.
Бадай, пана не хавалі,
Каб сабакі разарвалі.
Пахавалі пры даліне,
Каб па пану ваўкі вылі.
Бадай, пана громы ўбілі,
Як мы ручкі патамілі.

*Запісала В. А. Ляшчынская ў 1996 г.*

## ОЙ, ЗАКУРЭЛА, ОЙ, ДЫ ЗАДЫМЕЛА...

*Запісана ў в. Чырвоная Слабада Салігорскага раёна ад П. С. Кулеш (1913 г. н.)*

Ой, закурэла, ой, ды задымела
Ды сырымі дрывамі.
Ой, няма як выйсці ды на свет белы
Нам за варагамі.
Сонейка ўзыйдзе, сонейка зайдзе
Ды за лесам дубовым,
А ты сееш, не прысядзеш
На полі скарбовым.

Ой, вяльможныя спаць палягуць,
А ты йдзі араці,
І ў нядзелю маем дзела,
Некалі гуляці.
Накалоцім, намалоцім —
Возам не павезці,
А прыйдзецца за Каляды —
Няма чаго есці.
Зноў у хаце закурыцца
Асінай-дрывамі,
Годзе, братцы, трэба біцца
За зямлю з панамі.

*Запісала В. А. Ляшчынская ў 1996 г.*

## ПРЫЙШЛА ЧЭЛЯДЗЬ СКАЧУЧЫ...

*Запісана ў в. Налібокі Стаўбцоўскага раёна*
*ад М. А. Башура*

Прыйшла чэлядзь скачучы,
А пан за ёю скачучы.
— Вярніся, чэлядзь, вярніся,
На другі гадок найміся.
— Каб ты, панок, не даждаў,
На другі гадок не наймаў.
Як мне ў цябе надаела,
Цясовыя сталы мыючы,
Белыя пасцелі мыючы.

## НЕ ПЛАЧ, МАЯ ДЗЕТКА...

*Запісана ў в. Славені Шклоўскага раёна*
*ад Л. М. Цудзікавай (1954 г. н.)*

Не плач, мая дзетка,
Не плач, мая родна,
Вунь пан ідзець,
На татку, на мамку
Ён бізун нясець.
У тым бізуне скураты ўвіты,
На тым бізуне слёзы паліты,
Слёзкі крывавыя, з сэрца раняныя,

Схавайся ты, дзетка, ты, родна,
Хай твае вочкі закрыюцца вавекі,
Хай не ўбачыш ты гора мужыцкага,
Хай не пазнаеш ты болі жаночай.
Не плач, мая дзетка,
Не плач, мая родна.

*Запісалі В. У. Бародзіч,*
*Ф. В. Барсукова ў 1991 г.*

## ШУМНЫЯ БЯРОЗЫ...

*Запісана ў в. Рафалін Асіповіцкага раёна*
*ад Р. П. Гоціна* (*1911 г. н.*)

Шумныя бярозы пабяліў мароз,
Хацеў бы я плакаць, ды не маю слёз.
Хацеў бы я пеці аб сваёй бядзе,
Ды мне сэрца ные, песенька не йдзе.
Хацеў бы, каб воля гуляла са мной,
Каб сонейка грэла, як грэе вясной.
Але, божа мілы, волі не відаць,
Кайданы няволі на руках звіняць.
Гэй, пайду я ў поле долечку шукаць
З востраю касою, як на сенажаць.
Ой, пайду я ў поле, як бы на вайну,
Шукаючы волю, шаблечкай махну.

*Запісала І. В. Чыстая*

## ПАЙШОЎ, ПРАЙШОЎ ПРАЗ ДЗЯРЭЎНЮ...

*Запісана ў в. Прысынак Уздзенскага раёна*
*ад П. І. Шыдлоўскага*

Пайшоў, прайшоў праз дзярэўню
Парань маладзенькі.
Шапачку зняў, дабрадзею,
Кланяўся нізенька.
— Ой, бывайце, браты, сёстры,
Бывай, бацька, маці,
Забіраюць мяне ў войска
Цара сахраняці.
Заліваюцца слязамі
Бацькі й маці вочкі,

Бо, магчыма, больш не ўбачаць
Роднага сыночка.
Просіць бацька, просіць маці
Сына дарагога:
— Ой, як будзеш ваяваці,
Не страляй нікога.
Ой, як будзеш ваяваці,
Не страляй нікога,
А застрэль сваёю куляй
Ты цара ліхога.
Бачыш, паны злы, паганы,
Ганьбяць нашу долю.
Ой, не бачыць людзям шчасця,
Пакуль цара воля.

*Запісала А. Н. Глябовіч у 1988 г.*

# РЭКРУЦКІЯ І САЛДАЦКІЯ ПЕСНІ

## АПОШНІ НЫНЯШНІ ДЗЯНЁЧАК...

*Запісана ў в. Судзілавічы Драгічынскага раёна ад П. С. Крыжывіцкай (1925 г. н.)*

Апошні ныняшні дзянёчак
Гуляю з вамі я, сябры.
А заўтра рана чуць святочак
Загалосіць уся мая сям'я.
Заплача маці і мая сястра,
Заплача брат і мой айцец.
Ісці ў салдаты выпаў жрэбій.
І вольным дням прыйшоў канец.
Яшчэ заплача дарагая,
З якой я тры гады гуляў,
Вясці к вянцу яе збіраўся,
Любіць да гроба абяцаў.
Каляска хутка падкаціла
Каля дома майго.
У калясцы старшыня крычаў:
— Гатоўце сына свайго!
Хрысцьянскі сын даўно гатовы.
Сям'я ўся замертво ляжыць.
Пайду цяпер я к жызні новай,
Цару, айчыне маёй служыць.

*Запісала С. А. Сярогіна*

## ЧАГО, ЧАГО, БЕЛ МАЛОЙЧЫК, ЗАСМУТНЕЎ?..

*Запісана ў в. Палонка Баранавіцкага раёна*
*ад Н. Ф. Пісарэнка (1919 г. н.)*

— Чаго, чаго, бел малойчык, засмутнеў?..
— Як жа мне, маладому, не смутнець:
Загадалі ў падмаскоўныя палкі —
Да ці любіш ты расійскія дзяўкі?
Ой, як жа мне, маладому, не любіць?
Матка плача, выпраўляючы,
Сястра плача, выпраўляючы,
Младша сястра наперад зайшла,
Яшчэ братку болей жалю задала.
— Ты, наш братко, найяснейшы сакалок,
Прыедзь, прыбудзь к нам у госцікі ў гадок.
— Не ў такія, сястра, ручкі папаў,
Каб часта ў вас у госцейках бываў.

*Запісала І. А. Маціевіч у 1996 г.*

## ЗАКУКАВАЛА ЗЯЗЮЛЕЧКА...

*Запісана ў в. Палонка Баранавіцкага раёна*
*ад Н. Ф. Пісарэнка (1919 г. н.)*

Закукавала зязюлечка
Ў вішнёвым садочку,
Заплакала родная мамка
Па сваім сыночку.

Ой, не так жа заплакала,
Як загаласіла:
Узялі, здалі ў салдаты
Маладога сына.

*Запісала І. А. Маціевіч у 1996 г.*

## У СУБОТУ ПОЗНЕНЬКА, У НЯДЗЕЛЬКУ РАНЕНЬКА...

*Запісана ў в. Шундры Слонімскага раёна*
*ад Г. А. Раманава (1932 г. н.)*

У суботу позненька, у нядзельку раненька
Кавала зязюля ў саду галасненько,
Кавала зязюля ў саду галасненько.
Гэта не зязюля, то родная маці,
Яна выпраўляла сына ў салдаты,
Яна выпраўляла сына ў салдаты.
— Я думала, сынку, вяселле сыграем,

А мы цябе, сынку, у войско выпраўляем,
А мы цябе, сынку, у войско выпраўляем.
Я думала, сынку, будзе нявестка ў хаце,
А па табе, сынку, дзяўчыненька плача,
А па табе, сынку, дзяўчыненька плача.
Як будзеш далёко, будзеш ліст пісаці,
А я цябе, сынку, буду ажыдаці,
А я цябе, сынку, буду ажыдаці.
— Каб ты, мамка, знала, якое мне гора,
То б ты пераплыла цераз сінё моро,
То б ты пераплыла цераз сінё моро.
Каб ты, мамка, знала, як я тут страдаю,
Ты б шэрай зязюляй ка мне прылятала,
Ты б шэрай зязюляй ка мне прылятала.

*Запісала А. А. Акуліч у 1999 г.*

## ВЫСТУПІЛА ЦЕМНА ХМАРА...

*Запісана ў в. Цяглевічы Зэльвеньскага раёна ад Т. М. Санукевіч* (*1905 г. н.*)

Выступіла цемна хмара,
А за цемнай хмарай — сіня.
Парадзіла ўдованька
Харошага сына.
Парадзіла яна яго
Цёмнае ночы,
Дала яму цёмна лічка
І цёмныя вочы.
— Было, мая родна маці,
Сініх воч не даці.
Запісалі ў канцылярыі
У салдацікі ўзяці.
Я салдатаў не баюся,
Скора адслужуся,
Сам малады, конь вараны,
Скора адслужуся.
Як выехаў за вароты,
Нізенько скланіўся:
— Прашчаю, прашчаю ўся дзярэўня,
Можа з кім сварыўся,
Пакрапляйце дарожанькі,
Штобы не курэлі,

Уцяшайце атца, матку,
Штобы не тужылі.
Пакраплялі дарожанькі
Яны ўсе кураці,
Уцешалі атца, матку,
Яны ўсё тужаці.

*Запісала І. І. Стракач у1995 г.*

## ПРЫЛЯЦЕЛІ ГУСІ З ЧУЖОЙ КРАІНЫ...

*Запісана ў в. Бялюнцы*
*Воранаўскага раёна*
*ад Ю. В. Мікялевіча (1924 г. н.)*

Прыляцелі гусі з чужой краіны,
Заплакалі хлопцы, да прыёму ідучы.
Яны сталі, заплакалі,
Сталі іх прызываці.
Скуль знайшлася шэрая зязюля,
Стала кукаваці.
Гэта не зязюля — родная матуля
Стала размаўляці:
— Ой, вы, прыёмшчыкі,
Вы, добрыя людзі,
Выпусціце майго сыночка
На волю гуляці.
— Ой, не пусцім, мы не пусцім
На волю гуляці.
А хто ж будзе на шырокім полю
Ды з немцамі ваяваці?
Заўтра раненько, чуць слоненько ўзышло —
На ўказана врэмя поезд падышоў.
Саджусь я ў поезд, кланюсь галавой:
— Прашчай, дарагая, не ўвідзімся з табой,
Як я буду жыці ў чужой старане.
Прашу, дарагая, пісьмо напісаць,
Я буду на бумаге словы цалаваць.
Не жыць нам з табою,
Не жыць ва дваём,
Бо нас разлучаюць,
Як ночаньку з днём.

*Запісала А. М. Чарняўская ў 1995 г.*

## СТАЯЛА БЯРОЗА ТОНКА І ВЫСОКА...

*Запісана ў в. Хілякі Берастаўіцкага раёна*
*ад Н. М. Баярчук (1935 г. н.)*

Стаяла бяроза тонка і высока,
Гэй, гэй, тонка і высока,
На корань глыбока,
На лісце шырока,
На лісце шырока.
На гэтай бярозе
Усе і кукувушкі куюць,
Усе і кукувушкі куюць.
І салавейчыкі свішчуць,
І салавейчыкі свішчуць,
Усе і малойчыка ішчуць.
Як свісталі, так свісталі,
Малойчыка ізыскалі,
Гэй, гэй, ізыскалі,
Малойчыка ізыскалі,
Назад ручкі звязалі,
Назад ручкі звязалі,
На хурманачкі пасаджалі,
Самі селі на задочку,
Рэкруціка ўперадочку.
Серы коні, паганяйце,
На рэкруціка паглядайце.
Гэй, гэй, на рэкруціка паглядайце,
Штобы коні не ўтамілі,
Рэкруціка не згубілі.

*Запісала І. У. Міргародава ў 1990 г.*

## СЫН НА ВАЙНУ САБІРАЎСЯ...

*Запісана ў в. Палонка Баранавіцкага раёна*
*ад Н. Ф. Пісарэнка (1919 г. н.)*

Сын на вайну сабіраўся,
Да ў бацюшкі не пытаўся.
Сядлаў каня варанога,
А сядзелка залатое.
Да сеў жа ён ды паехаў,
Едзе поле і другое,
На трэцяе ўз’язджае.
Азірнецца назад сябе:
За ім — войска, як мак цвіце,
За ім — пулі, як дождж ідзе.

*Запісала І. А. Маціевіч у 1996 г.*

## ЧУЛА, ДА ЧУЛА МАЯ ДОЛЯ...

*Запісана ў в. Дакудава Лідскага раёна*
*ад Н. І. Кудзі (1914 г. н.)*

Чула, да чула мая доля,
Чула, да чула мая доля,
Што не быці мне ўдома.
Што не быці мне ўдома.

А мне братцы не сказалі,
А мне братцы не сказалі,
Што ў салдаты запісалі.
Што ў салдаты запісалі.

А ў нядзелю на раначку
А ў нядзелю на раначку
Шлюць па мене фурманачку.
Шлюць па мене фурманачку.

Шлюць па мене, маладога,
Шлюць па мене, маладога,
Дайце каня варанога.
Дайце каня варанога.

Паганяй жа, фурман, клячу,
Паганяй жа, фурман, клячу,
Чы ня відзіш, што я плачу.
Чы ня відзіш, што я плачу.

А я плакаць, плакаць буду,
А я плакаць, плакаць буду,
Сваёй долі не забуду.
Сваёй долі не забуду.

А мне братцы не сказалі,
А мне братцы не сказалі,
Што ў салдаты запісалі.
Што ў салдаты запісалі.

*Запісала С. А. Бабкова ў 1989 г.*

## У ЧЫСТЫМ ПОЛІ ВЕЦЕР ВЫЕ...

*Запісана ў в. Асава Воранаўскага раёна*
*ад В. У. Захарка (1948 г. н.)*

У чыстым полі вецер вые,
Вецер вые, навявае,
Сонца грэе, прыгравае,
Бацька сына выпраўляе:
— Едзь ты, сынку, ад мяне,
Бо выпадае на цябе.
Старша сястра каня вядзе,
А селядорша сядло нясе,
А сама менша з браткам ідзе,
Порце нясе і распытвае:
— Калі, браце, у гасцях будзеш?
— Вазьмі, сястра, пяску з гары,
Да пасей пясок на камні.
Як з пяску ружа ўзыдзе,
Тады брацец у гасцях будзе.

*Запісала Э. Я. Тупко ў 2007 г.*

## А Ў НЯДЗЕЛЮ РАНЮСЕНЬКА НА БАЗАРЫ...

*Запісана ў в. Сяргейкі*
*Сенненскага раёна*
*ад Н. В. Шыбека* (*1911 г. н.*)

А ў нядзелю раненька на базары
Ударылі салдацейкі ў барабаны.
Халасты ідзець, песні пяець
І ў гуслі іграець,
Зялёную дубровачку ўзвелічаець:
— Бадай, цябе, дубровачка, узеляніла,
Як ты мяне, маладога, развесяліла.

Жанаты ідзець, сільна плачыць:
— Бадай, цябе, дубровачка, усушыла,
Як мяне, маладога, засмуціла.
І з жаной маладой разлучыла,
І з жаной маладой, з добрымі дзецьмі.

*Запісала Н. А. Русовіч у 1982 г.*

## У ПОЛІ СНЯЖОК КУРЫЦЬ...

*Запісана ў в. Гірмантаўцы*
*Баранавіцкага раёна*
*ад М. А. Журын* (*1928 г. н.*)

У полі сняжок курыць,
Там салдат убіт ляжыць.
А над ім конік стаіць.
— А ты, конік вараны,
Да не стой нада мной,
Ды бяжы дарогаю, дарогаю шырокаю,
Як падбяжыш пад варотцы,
Стукні, грукні капыцікам,
Каб капытца зазвінелі,
Каб варотца адляцелі.
Табе выйдзе стара бабка,
Стара бабка — мая матка.
Узяла каня за цугелькі
Ды павяла ў стаенькі,
Дала каню аўса-сена.

— Ах, ты, конь вараны,
Ці не бачыў майго сына?
— Вазьмі, маці, жыта жменю
Ды пасей па прыгуменню.
Як жыта аўсом сыдзе,
Дык твой сын з вайны прыйдзе.

*Запісала Т. В. Москаль у 1996 г.*

## У ПОЛІ СНЯЖОК КУРЫЦЬ...

*Запісана ў в. Прусянічы*
*Талачынскага раёна*
*ад М. Ц. Мяснікавай* (*1911 г. н.*)

У полі сняжок курыць.
— Дзе падзеўся мой сыночак?
А ці ў піру ён спіўшыся?
Ці з дзеўкамі ажаніўшыся?

— Ні ў піру ён спіўшыся, —
Ажанілі быстры пулі,
А злажылі ветры-буры.
Жана яго — сырая зямля.

— Каб я мела сіза пер’я,
Быстра крылья,
Я б к сыночку паляцела,
Я б ямочку раскапала,
Яго костачкі сабрала,
Я б над ім пракукавала,
Як шэрая зязюлечка,
Салдацкая мамулечка.

## ОЙ, ДА Ў ПОЛІ...

*Запісана ў в. Мокрава*
*Лунінецкага раёна*
*ад Н. А. Пракаповіч* (*1913 г. н.*)

Ой, да ў полі
Стаяць два дубочкі,
Схілілася верхі да купочкі,
Схілілася верхі да купочкі.

Прыляцелі ды два галубочкі,
Селі, упалі паміж каліною,
Гаворылі самі, між сабою:
— Горэ тому, дый не жанатаму,
Яшчэ й горэй, каторы ажаніўся:
Ажаніўся — забралі ў салдаты.
Па ім плачэ яго родна маці.
— Не плач, маці, бо ўжэ ты старая,
Нехай плача жонка маладая,
Ешчэ к тому дзеціна малая.

*Запісала Т. А. Капліч у 1988 г.*

## А ЗАПІЎСЯ, ЗАГУЛЯЎСЯ БЕЛ МАЛОЙЧЫК...

*Запісана ў в. Ухвала Крупскага раёна ад Н. Л. Лабазавай* (*1920 г. н.*)

А запіўся, загуляўся бел малойчык,
Ад таварышчэй ён астаўся.
— Таварышы, братцы вы мае,
Хоць жа вы мяне тут пакіньце,
Каня майго варанога не кідайце.
Адвядзіце яго к атцу, к мацеры,
К атцу, мацеры, маладой жане.
Маладой жане перадайце:
Еслі ёсць другой, пусць абвянчаецца,
А меня дамой не дажыдаецца.
Ажаніла мяне пуля быстрая,
Абвянчала мяне сабля вострая.

*Запісала Н. Д. Каразей у 1996 г.*

## А Ў МАСКВЕ, У МАСКВЕ, ВА СТАЛІЦЫ...

*Запісана ў в. Ухвала Крупскага раёна ад Н. Л. Лабазавай* (*1920 г. н.*)

А ў Маскве, у Маскве, ва сталіцы
У новыя барабаны барабанюць,
На выбор салдатаў выбіраюць.
А бяруць халастых і жанатых.

Халастыя ідуць, песні пяюць,
А жанатыя ідуць, сільна плачуць.
Халастыя жанатых разважаюць.
— Ой, стойце, братцы, вы не плачце.
— А як жа нам, братцы, ды й не плакаць?
Старыя бацькі паўміраюць,
Маладыя жоны паўдавеюць,
Дробныя дзеткі пасірацеюць,
А маладым жа жонам муж'я будуць,
Толькі дробным дзеткам таткі не будзець.

*Запісала Н. Д. Каразей у 1996 г.*

## ОЙ, НЕ СТОЙ, НЕ СТОЙ НА ГАРЫ КРУТОЙ...

*Запісана ў в. Гірмантаўцы Баранавіцкага раёна ад К. М. Татарыновіча (1909 г. н.)*

Ой, не стой, не стой на гары крутой,
Не спускай галля на сіня мора.
Па сінім моры карабель плыве,
Карабель плыве аж вада раве.
У тым караблю аж тры палкі салдат.
Афіцэр-маёр Богу моліцца,
Радавы салдат дамой просіцца:
— Афіцэр-маёр, адпусці дамой,
Адпусці дамой к жане маладой.
Ой, не стой, не стой на гары крутой.
Не спускай галля на сіня мора.
Па сінім моры карабель плыве,
Карабель плыве аж вада раве.

*Запісала Т. В. Москаль у 1996 г.*

## ОЙ, ДА ТЫ, КАЛІНУШКА-РАЗМАЛІНУШКА...

*Запісана ў в. Малькавічы Ганцавіцкага раёна ад В. М. Гардзей (1926 г. н.)*

Ой, да ты, калінушка-размалінушка,
Ой, да ты, калінушка-размалінушка,
Ой, да ты не стой, не стой
На гарэ на крутой.

Ой, да ты не стой, не стой
На гарэ на крутой.
Ой, да ты не раняй лісця
На сіне морэ.
Ой, да ты не раняй лісця
На сіне морэ.

Ой, да па сінем мору карабель плывёт,
Ой, да па сінем мору карабель плывёт,
Ой, да карабель плывёт
І вална ревёт.
Ой, да карабель плывёт
І вална ревёт.
Ой, да ў том караблі,
Ой, да ў том караблі
Тры палка салдат,
Тры палка салдат.

Ой, да тры палка салдат
Маладых рабят.
Ой, да тры палка салдат
Маладых рабят.
Ой, да афіцэр-маёр
Богу моліцца.
Ой, да афіцэр-маёр
Богу моліцца.
Ой, да радавой салдат
Дамой просіцца.
Ой, да радавой салдат
Дамой просіцца:

— Ой, да афіцэр-маёр,
Адпусці дамой,
Ой, да афіцэр-маёр,
Адпусці дамой.
Ой, адпусці дамой
К атцу, мацеры радной.
Ой, адпусці дамой
К атцу, мацеры радной.

К атцу, мацеры радной
Да к жэне маладой.
К атцу, мацеры радной
Да к жэне маладой.
Ой, да жэна малада,
Сына ўрадзіла.

Ой, да жэна малада,
Сына ўрадзіла.
Ой, да сына ўрадзіла,
У рэчку бросіла.

*Запісала С. П. Лагвіновіч у 1996 г.*

### ОЙ, У ПОЛІ СНЯГІ ВЫПАДАЮЦЬ...

*Запісана ў в. Ляхова Навагрудскага раёна*
*ад М. Р. Шакуля* (*1927 г. н.*)

Ой, у полі снягі выпадаюць,
А ў агародзе макі зацвітаюць.
Адна маці стаяла ў дарозе,
Дажыдала сына із пахода:
— Вярнісь, сынко, вярнісь дадому,
Пасцялю табе пасцельку пухову.
— Сцялі, матко, ужо сабе — не мне,
А я накрыюсь кляновым лісцем
І пайду з сваім таварыствам.
— Вярніся, сынко, вярніся дадому,
Змыю табе галоўку вадою!
— А ў полі дробны дожджык хвошча,
Ён мне галоўку спалошча.

*Запісала Т. М. Міхан у 1996 г.*

## КАЗАЦКІЯ ПЕСНІ

### ЕХАЎ КАЗАК НА ВАЕНЬКУ...

*Запісана ў в. Амельна Пухавіцкага раёна*
*ад В. В. Кролік* (*1926 г. н.*)

Ехаў казак на ваеньку,
Прашчаўся з сваёю міленькай:
— Прашчай, міленька, чарнабрывенька,
Я ўязджаю на ваеньку.
Дай мне, дзеўчына, хустыну,
Можа, ў баю я загіну,
Накрыюць вочы чорныя ночы,
Апусцяць ў магілу.

Дала дзяўчына хустыну.
Казак у баю ды загінуў.
Накрылі вочы чорныя ночы,
Ды й апусцілі ў магілу.
Ніхто ж вот па ім не заплача,
Дзе ляжыць цела казака.
Толькі той воран сядзіць на таполі,
Сядзіць ды жаласна крача.
А тая дзяўчына зачула,
Яна па казаку ўздыхнула:
— Спі, мой міленькі, чарнабрывенькі,
Я на цябе не забыла.

*Запісала А. В. Шунейка ў 1988 г.*

## ЗА КУБАНСКАЙ ГАРОЙ...

*Запісана ў в. Крупенікі Любанскага раёна*
*ад К. Я. Салавей* (*1914 г. н.*)

За кубанскай гарой
Там казак маладой,
Ён каня ўсё спасаў,
Коню травачку рваў,
Аганёк раскладаў.
Коню травачку рваў,
Аганёк раскладаў.

Цёплай воды награваў,
Цёплай воды награваў,
Свае раны прамываў:
— Ой, вы, раны мае,
Раны больные,
Вы да сэрца дайшлі.
Сэрца кроўю аблілось,
Сэрца кроўю аблілось.

Перад смерцю сваёй
Ён з канём гаварыў:
— Ох ты, конь, сівай конь,
Конь, таварыш дарагой.
Ой, бяжы, сівай конь,
Той дарогай сталбавой,
Той дарогай сталбавой.

Не кажы, сівай конь,
Маёй жане маладой,

Не кажы, сівай конь,
Што я ўбіты ляжу,
Да скажы, сівай конь,
Што я жанаты хажу.

Ажаніла мяне куля быстрая,
Абвянчала мяне шабля вострая.
Да ўзяў сабе я жану ціха-смірную —
Кулю быструю.

*Запісала Л. Трубач у 1980 г.*

## КАЗАК КОНІКА СЯДЛАЕ...

*Запісана ў в. Ліпень Асіповіцкага раёна*
*ад К. В. Давідовіч (1914 г. н.)*

Казак коніка сядлае:
— Рыссю, вароны,
Аж да ціхага Дунаю.
Каля ціхага Дунаю
Станеш коню, падумаем:
Ці мне ўтапіцца?
Ці з каня мне ўбіцца?
І з каня я не ўб'юся,
І дадому варачуся,
І ў Дунаі не ўтаплюся,
На сваю радзіму
Я дадому вярнуся
Да бацькі, да маці.

*Запісалі І. Слізюк, Ж. Мірук,*
*Т. Русак у 1977 г.*

## ЕХАЎ КАЗАК З УКРАІНЫ...

*Запісана ў в. Астрашыцкі Гарадок*
*Мінскага раёна*
*ад А. І. Каваленкі (1917 г. н.)*

Ехаў казак з Украіны,
Пусціў каня ў даліну.
Пад зялёную яліну
Лёг на цэлую гадзіну.
Шчаслівая гадзіначка!
Прыйшла к яму дзевачка.

— Устань, казак, абудзіся!
Едуць татарскія раці,
Хочуць твайго каня ўзяці.
Каня ўзяці варанога,
Цябе забіці, маладога.
Каня возьмуць — другі будзе,
Цябе заб'юць — жаль мне будзе.
— Знаць ты, дзеўка, мяне любіш,
Што так рана мяне будзіш!
— Каб я цябе не любіла,
То б цябе я не будзіла.
Цябе, казак, шчыра люблю,
На край света з табой пайду.
— Ты, дзявіца маладая,
Твая галава глупая.
Дзе са мной табе хадзіці,
Па ўсяму свету брадзіці?
Будзеш дома праклінаці
І на мяне наракаці.

*Запісала В. М. Міхалевіч у 1990 г.*

## ІШОЎ КАЗАК З ДОНУ...

*Запісана ў в. Ждановічы*
*Шклоўскага раёна*
*ад Г. С. Сталярэка* (*1915 г. н.*)

Ішоў казак з Дону,
З Дону да дому.
Сеў ён над ракою,
Еў хлеб ён з вадою,
Кляў сваю долю:
— Доля мая, доля,
Чаго не такая,
Як тая людская?
Усе людзі п'юць-гуляюць,
Усё добрае маюць,
А мы с табой, доля,
Не п'ем, ні гуляем
І нічога не маем.

Адгукнулась доля
На той бок сіня мора:
— Ты, няўдача-бурлача,

Не кляні сваю долю,
Твая доля як доля,
А сам ты нехарошы.
Дзе ты пагуляеш —
Усё ў карты прайграеш.
Дзе ж ты заначуеш —
Усё прап'еш, прагуляеш.

*Запісалі А. Крупская, Т. Казлоўская,*
*Т. Кальвінскоўская ў 1978 г.*

## У ЧЫСТЫМ ПОЛІ ПРЫ ДАРОЗЕ...

*Запісана ў в. Скарабагатаўшчына*
*Дзяржынскага раёна*
*ад Н. С. Казловай (1910 г. н.)*

У чыстым полі пры дарозе
Казак забіты ляжыць,
Над ім конь стаіць.
Ён яму адказвае:
— Ой, коню ж мой вараненькі,
Не бі зямлю капытамі,
Бо ты зямлі не даб'ешся,
А з мора вады не нап'ешся.
Бяжы, коне, дарогай шырокай,
А далінай глыбокай,
Глядзі, каб казакі не злавілі,
Сядзелка твайго не сарвалі,
Сядзелка тваё не простае — залатое.
Падбяжы, коню, пад варота,
Заржы, коню, як сірота.
Выйдзе бацька — рассядлае,
Выйдзе маці — распутае.
— Ой, коню ж мой вараненькі.
Твой сынок ажаніўся,
Узяў жонку-сяляначку,
У чыста поле зямляначку.
Сеяў жыта — няма ўсходаў,
Німа ж майго сына з паходу.
Сеяў грэчку — вална змыла,
Майго ж сына вайна ўбіла.

*Запісалі С. А. Сайчын,*
*Н. Ю. Свірко ў 1986 г.*

## ЛЕТНЯЯ НОЧКА
## ДЫ ЯСЕННЯ...

*Запісана ў в. Заходняя Морач*
*Салігорскага раёна*
*ад А. Я. Глушань (1921 г. н.)*

Летняя ночка ды ясення,
Галовачка мая бедная,
— Дзе ж ты будзеш ды начаваці?
— У цёмным лесе ды на верасе.
— Што ж ты будзеш ды вячэраці?
— Шчуку-рыбу ды ашытрыну.
Мне здалося, што нямножка спаў,
Мой конік недалёку стаў,
Выяў траву да паўдаліну,
Выпіў вады да паў-Дунаю.

Выйшла дзяўчонка да жыта жаці,
Стала казака прабуджаці:
— Устань, устань, да казачанька,
Армія ідзе — цябе возьме,
Цябе ж возьме ды каня заб'е.
Каня заб'юць — конь другі будзе,
Цябе заб'юць — да мне жаль будзе.

*Запісала Т. А. Назарук у 1987 г.*

## ОХ, ТЫ, КОНЬ,
## ТЫ МОЙ КОНЬ...

*Запісана ў в. Пяршаі*
*Валожынскага раёна*
*ад Я. І. Мянёк*

Ох, ты, конь, ты мой конь,
Ты таварыш, друг мой,
Ой, ляці ж ты, мой конь,
К бацьку-мацеры дамой.
Не кажы ж ты, мой конь,
Што я ўбіты ляжу,
А кажы ж ты, мой конь,
Што ажаніўшысь жыву.
Ажаніла мяне куля быстрая,
Павянчала мяне шабля вострая.

А сустэнцік* мой быў —
Ясен месяц свяціў,
А сустэнка* была —
Ясна месячна зара.
А сваточкі былі — ўсе дубочачкі.
Схаранілі мяне ў поўдарожачкі.

*Запісалі С. Малыш,*
*А. Махінай, Е. Ляўковіч*

## АРЫШТАНЦКІЯ ПЕСНІ

### ЦЮРМА, ЦЮРМА...

*Запісана ў в. Верасніца Жыткавіцкага раёна*
*ад Р. Ф. Каральца*

Цюрма, цюрма — какое слова,
Для всех пазорна і страшно,
Но для меня совсем другое,
З цюрмой я пазнакоміўся даўно.

Прывык к жалезным я рашоткам,
Прывык к цюрэмнаму пайку,
Прывык к ваеннаму свістку.

Глядзець в акно не дазваляюць,
Нельзя і громка гаварыць.
Скажы, скажы нам, касцер малады,
За што нас стануць біць?

Стаіць в угле вушак з вадой
І прыбіто калечка в сцяне.
Но навсегда са мной находзіцца,
Што палагаецца в цюрме.

Эх, мaць мая радная,
Зачэм на свет нас саздала,
Судзьбой такой нас нарградзіла,
Касцюм матроскі нам надзела.

*Запісалі Т. Всеўнік, Г. Дворнікава ў 1973 г.*

---

* *Сустэнт* — сябра, друг, таварыш (заўвага выканаўцы).

## НЕ СПІЦЦА І НЕ ЛЯЖЫЦЦА...

*Запісана ў в. Агаравічы Ганцавіцкага раёна ад А. Р. Красюк (1919 г. н.)*

Не спіцца і не ляжыцца,
І сон мяне не бярэ.
Прыдзі жа ка мне, дарагая,
І ўспакой мяне.

— Не раз я прыхадзіла
К цюрэмным варатам,
Усе камеры былі закрыты,
І стража стаяла ўся.

— Ежэлі б ты хацела,
То врэмечка знайшла,
Усе камеры былі адкрыты,
І стража ўся спала.

Ты думаеш, безумна,
Што я здзесь прападу.
Ежэлі я выйду на волю,
То ўсё табе атамшчу:

Рукі паламаю
І косці жа самну,
У сырую магілу адпраўлю,
А сам апяць у цюрму.

Цюрэмныя варота
Для нас атвораны,
Усе катаржныя работы
Для нас саздадзены.

*Запісалі А. Паўлюковец, Л. Нікалаенка*

## ТЭЧЭ РІЧКА НЭВЭЛЫЧКА...

*Запісана ў в. Ляплёўка Брэсцкага раёна ад Ф. Р. Ігнацюк*

Тэчэ річка нэвэлычка,
Бэрэгі крутые,
Сідзяць в цюрмах за кратамі
Хлопцы молодые.

— Ты, начальнік, ты, начальнік,
Ой, пусты додому,
Бо заскучыласа, бо зажурыласа
Дывчіна за мною.

— Не відпушчу, не відпушчу,
Бо ты довго будэш,
Ты напейся воды халоднае —
Пра любоў забудыш.

— Пыв я воду, пыв холодну,
Пыв-напывався,
Любів козак дывчіноньку,
Тай не забувався.

Умэр козак, умэр козак,
Тай помэрла слава.
Застанецца кінь воронэнькі,
Збруя золотая.

Того коня вороного
В полі расстрэляйтэ,
Тую збрую золотую
Дывчіне отдайтэ.

Коня вэдуць, збрую нэсуць,
Конь головку клоніць.
Стоіць дывчіна ў воротах,
Дрібны слёзы роніць.

Ой, коня воронога
В полі расстрелялі,
Тую збрую золотую
Дівчінэ отдалы.

*Запісала Г. Гурэвіч*

## А Ў ЦЮРМЕ АКНО ВЫСОКА...

*Запісана ў в. Калдычава Баранавіцкага раёна*
*ад В. М. Калейчык (1912 г. н.)*

А ў цюрме акно высока,
Два жалезныя замка,
Сцены камеры высокі,
Не відна сонца а ні дня.
Сцены камеры высокі,
Не відна сонца а ні дня.

Звініць званок нашчот праверкі,
Пісар з кнігаю ідзе:
— Выйдзі, Каця, із цемніцы,
Суд даўно цебя завёт.
Выйдзі, Каця, із цемніцы,
Суд даўно цебя завёт.

Кацю к суду падвадзілі,
Сталі выракі чытаць.
Прысудзілі беднай Каце
Дваццаць выстралаў прыняць.
Прысудзілі беднай Каце
Дваццаць выстралаў прыняць.
Ўзялі Кацю к падрастрэлу,
Далі волю гаварыць.
Каця голаву скланіла:
— Што ж са мной пачнуць рабіць?
Каця голаву скланіла:
— Што ж са мной пачнуць рабіць?

Ах, вы, панства-паліцаі,
Ваша права ні к чаму.
Куюць, гонюць паліцманы —
Вы ж дайце волю мужыку.
Куюць, гонюць паліцманы —
Вы ж дайце волю мужыку.

Дзевятнаццаць праляцела
Міма Каціных грудзей,
А дваццатая засела,
Крэпка к сэрцу прылягла.
А дваццатая засела,
Крэпка к сэрцу прылягла.

Ах, вы, пцічкі-канарэйкі,
Вы ляціце высако,
Накажэце роднай маме,
Што ўжо смерць недаляко.
Накажэце роднай маме,
Што ў жо смерць недаляко.

Накажэце ўсем знакомым,
Хай прыедуць, забяруць
І вянком з чырвоных кветак
Маю магілу абаўюць.
І вянком з чырвоных кветак
Маю магілу абаўюць.

Пахаваюць ў чыстым полі,
Дзе хадзіла мая маць,
Куды хадзіла маладая
Чырвоны сцягі вывяшаць.
Куды хадзіла маладая
Чырвоны сцягі вывяшаць.

*Запісала С. Сідзіна*

## ЧУМАЦКІЯ ПЕСНІ

### ГУЛЯЎ ЧУМАК...

*Запісана ў в. Барталамееўка*
*Веткаўскага раёна*
*ад М. Я. Кавалёвай (1918 г. н.)*

Гуляў чумак, ды гуляў бурлак
А сем лет па Крыму,
А сем лет па Крыму.
Да случылась да с чумаком
Не с Крыму едучы,
Не с Крыму едучы.
А случылась ды с чумаком
Ды валоў пасучы,
Ды валоў пасучы.
А ўсе волы пахрамелі,
А чумак болен стаў,
А чумак болен стаў.

А ляжыць чумак, ды ляжыць бурлак
Тры дні на лугу,
Тры дні на лугу.
А ніхто таго чумачэньку да не даведаецца.
А прыйшоў жа к таму чумачэньку,
А прыйшоў жа к таму чумачэньку.
Таварыш верной.
— Скажы ты, чумачэнька,
Скажы ты, чумачэнька
Чым ты бальной?
— А баляць жа мае ножанькі,
А баляць жа мае ножанькі,
А баліць жа мая галава.

*Запісала А. П. Гаркавая ў 1984 г.*

## ОЙ, ВАЛЫ МАЕ, ВАЛЫ...

*Запісана ў в. Самахвалавічы Мінскага раёна ад М. Ц. Цяржцевай*

Ой, валы мае, валы,
Валы крутарогі.
А праездзіў я на вас
Усе крымскія дарогі.
Ах, валы мае, валы,
Валы адной масці,
А дзе будзем начаваць?
— У дзевачкі Насці.
А што будзем вячэраць
У дзевачкі Насці?

Ой, зусім нямножка з’еў:
Крыльца і раберца,
Як узяло чумака
За шчырае сэрца.

## ЧУМАК ВОДКУ П’Е...

*Запісана ў в. Гольцы Столінскага раёна ад Д. Ц. Іванцовай* (*1911 г. н.*)

Чумак водку п’е,
У яго грошы е.
За ім яго рідна маты
Дробны слёзы лье:

— Ох, сын мой, покынь водку пыць,
Ой, да покынь дівчіну любыць.
— Ох, мамка мая,
Да нэ покіну я, бо солодкая.
Да ж нэ покыну дівчыну
Любіці, бо хорошая.

*Запісала Т. У . Папко ў 1979 г.*

## ТЫ, ЧУМАЧА, ЧУМАЧА...

*Запісана ў в. Галоўчыцы*
*ад С. М. Хвастовіч*

Ты, чумача, чумача,
Жыццё тваё лядача.
Не косіш ты, не арэш.
Чаго рана з Крыму ідзеш,
Усіх таварышаў вядзеш?

— Вяду, вяду, да не ўсіх,
Толькі няма аднаго —
Братца майго родненькага,
Самага большанькага.
Ён застаўся ў Крыму,
Прабіла соль галаву.
Не соль прабіла слёзы
Клаўшы соль на возы.

*Запісала А. Ц. Аўдзейчык*

## ОЙ, НІКОМУ ТАК НЕ ДОБРЭ...

*Запісана ў в. Цераблічы Столінскага раёна*
*ад В. М. Крыжан* (*1934 г. н.*)

Ой, нікому так не добрэ,
Як тому чумаку,
Тому чумаку,
Шчо й наберэ гарэлочкі
Дай людзей частуе,
Дай людзей частуе.

Ой, як пілі, то й хвалілі,
Братком называлі,
Братком называлі.

А як выйшлі із карчомкі,
Дурачком назвалі,
Дурачком назвалі.

Ой, не есць вон сын чумацкій,
Есць вон сын бурлацкой,
Есць вон сын бурлацкой.
Пропіў волы, пропіў коні,
Ерма всей занозы болей.

А сам сеў жэ конец стола
Дый думу думае,
Дый думу думае.
Продаў коні, продаў волы,
А грошэй чорт мае.

*Запісала А. Р. Мікша ў 1991 г.*

## ЧУМАЧЭ, ЧУМАЧЭ...

*Запісана ў в. Лашукі Клецкага раёна*
*ад Л. П. Перапечка*

— Чумачэ, чумачэ,
Чаго зажурыўся?
Ці валы прысталі,
Ці з дарожкі збіўся?

— Валы не прысталі,
З дарожкі не збіўся,
Таго зажурыўся —
Без долі ўрадзіўся.

Ой, пайду я ў поле,
Пашукаю долі.
Не знайшоў я долі,
Знайшоў быстру рэчку.

Вышла дзяўчыначка
З зялёнага гаю:
— Не тапісь, казача,
Пойдзем пагуляем.

Не тапісь, казача,
Бо душу загубіш.
Пойдзем павянчаймась,
Калі мяне любіш.

Пайшлі венчаціся —
Няма папа дома.
Ці тваё няшчасце,
Ці не твая доля.

*Запісала Н. М. Місевіч*

## А ПРАЧНУЎСЯ ЧУМАК УРАНЦЫ...

*Запісана ў в. Азярычына Пухавіцкага раёна*
*ад В. А. Прымак (1929 г. н.)*

А прачнуўся чумак уранцы,
Ды палапаў па карманцы.

Усе карманы вывяртае,
А там грошай — чорт іх мае.

Скінуў чумак шапку,
— Лей, шынкарка, хоць паўкварту.

Шынкарачка трэцца, мнецца,
Завярнецца ды смяецца:
— Я налею чацьвярціну.
Дай мне грошай хоць палціну,

Тады будзем піць-гуляць,
Сабе дзевак выбіраць.

*Запісалі Т. В. Якавенка, Т. Г. Уласевіч у 1994 г.*

## ЧУМАК

*Запісана ў в. Здзітава Бярозаўскага раёна*
*ад Л. К. Мартысевіч (1919 г. н.)*

Поіхав чумак на рускій базар,
Ой, прысталі его волы, прыстаў чумак сам.
Дый прысталы яго волы, упаў чумак сам.
Упаў дай ляжыць.
Ой, да ніхто яго не пытае,
Шчо в его болыт.
Болыт чумака спіна і голова,
Быдна яго голованька, чужа сторона.
Быдна яго голованька, чужа сторона,
Прыйшоў да яго таварыш яго,
Прыйшоў да яго таварыш яго,
Бярэ яго за ручаньку, жалуе яго,
Бярэ яго за ручаньку, жалуе яго.
— Таварыш мой, не жалуй мяне,
Бяры маі ўсе грошы да й ратуй мяне.
Калі ж мала грошы, бяры яшчэ волы,
Ратуй, ратуй, чумачэнька, у чужой староне.
І ўжо чумака на могілы цэ нясуць,
І ўжо чумака на могілы цэ нясуць.
Яго волы рагатыя жаласна равуць,
Яго волы рагатыя жаласна равуць.
Жаласна рэвуць, копытамі б’юць,
Дорожкамі-сцежкамі до дому ідуць,
Дорожкамі-сцежкамі до дому ідуць.
Выйшла яго маты сына сустракаты,

Сюды-туды павернула — сына не відаты,
Сюды-туды павернула — сына не відаты.
Выходзіць жана, упала да зямлі:
— Прапаў, прапаў чумачэнька ў чужой старане,
Прапаў, прапаў чумачэнька ў чужой старане.

*Запісалі К. Суддзява, М. Церахава,*
*Н. Чабатарова ў 1971 г.*

## ОЙ, ГОРО ТОЙ ЧАЙЦЫ...

*Запісана ў в. Верасніца Жыткавіцкага раёна*
*ад С. С. Блоцкай (1926 г. н.)*

Ой, горо той чайцы,
Чаеццы-небозі,
Шчо вяла чаяняток
Пры бітой дорозе.

Ішлі чумакі,
Весело спявалі,
Стару чаечку загналі,
Чаянят забралі.

А чаечка в'ецца,
В сыру зямлю б'ецца,
К сырой зямлі прыпадае,
Чумакоў благае:

— Ой, вы, чумачэнькі,
Хлопцы маладзенькі,
Вярніце маіх чаянят,
Оны шчэ маленькі.

— Ой, чаечка наша,
Няпраўданька ваша,
Поварылі чаянятак,
Була добра каша.

— Бадай вы, чумакі,
Солі не пробралі,
Як вы моіх чаяняток
З гняздзечка забралі.

*Запісала Н. Акуліч у 1973 г.*

## ІШОЎ ЧУМАК ІЗ ДОЛУ ДО ДОМУ...

*Запісана ў в. Опаль Іванаўскага раёна*
*ад З. В. Еўтуховіч (1914 г. н.)*

Ішоў чумак із долу до дому
Дай сіў над водою,
Дай клынэ свою долю:
— Ой, доле ж моя, доле,
Чого ты такая,
Ек людска, ек чужая,
Ой, людска доля добра:
Вона леганько робіць
І хороша ходыць.

Ой, обозвалася доля
Дай на той бік мора:
— Ой, козачэ-бурлачэ,
Тэ плохэй розум маіш:
Дань у дань заробіш,
Прэда ніч — прогуляіш.
Ой, ты, вэнха доля,
Да віновата воля.

*Запісала В. М. Клышка ў 1979 г.*

### А Ў КІЕВЕ НА РЫНОЧКУ...

*Запісана ў в. Чудзін Ганцавіцкага раёна ад М. Ф. Лісінай*

А ў Кіеве на рыночку,
Там піў чумак горылочку.
Пропіў волы, пропіў воза,
Пропіў ярма, шчэ й занозы —
Усё чумацкае дабро.

Ой, устаў чумак дай уранці,
Шэвельнууся по корманці,
Усе карманы вывертае —
Аж там грошай — чорт іх мае.
Нечым пахмяліціся.

Скінуў чумак жупаніну:
— Дай, шынкарка, чацьвярціну.
Но шынкарка трэцца-мнецца,
Отвернецца — засмяецца.
Усё з чумака-дурака.

Ой, пайду я ў Палтаву,
Прожыву там рокоў пару,
Куплю волы, куплю воза,
Куплю ярма, шчэй й занозы.
Апяць буду чумаком.

*Запісала Н. У. Герасіменя ў 1990 г.*

## НАЙМІЦКІЯ ПЕСНІ

### ГОРКА ДОЛЯ ТЫ БАТРАЦКАЯ...

*Запісана ў в. Чырвоная слабада Салігорскага раёна ад П. С. Кулеш (1913 г. н.)*

Горка доля ты батрацкая,
Гарапашная, жабрацкая.
Праца цяжкая, сіберная —
На прыбыткі ды на панскія,
На папоўскія, дваранскія.
Гэй, збірайся, хлопцы жвавыя,
На расправы на крывавыя, —
На расправы-пажарышчамі
Ад маёнткаў-папялішчамі.

*Запісала В. А. Ляшчынская ў 1996 г.*

## ГОРКА ДОЛЯ ТЫ БАТРАЦКАЯ...

*Запісана ў в. Мыслабож*
*Ляхавіцкага раёна*
*ад Е. С. Дуброўскай (1914 г. н.)*

Горка доля ты батрацкая,
Гарапашная, жабрацкая.
Праца цяжкая, нязмерная,
Мазалёвая, сіберная.
На прыбыткі ды на панскія,
На папоўскія, дваранскія.
— Гэй, збірайся, хлопцы жвавыя
На расправы на крывавыя.
На расправы пажарышчамі
Ад маёнткаў папялішчамі.

*Запісаў С. І. Рачкоўскі*

## ДЗЕ ТЫ, БУРЛАК, БЫЎ...

*Запісана ў в. Бычын Бярэзінскага раёна*
*ад М. К. Аляшневіч (1910 г. н.)*

Дзе ты, бурлак, быў,
Дзе ты валачыўся,
Што па пояс намачыўся?
Ці на яры, ці на пшаніцы?
Хадзіў бурлак да дзявіцы
Вячэраць, бурлак.
Няма квасу, няма галушак,
Ляжыць бурлак без падушак.
Шчэ й бурлак не ўснуў,
Як яго хазяін прабудзіўся:
— Уставай, бурлак,
Ідзі за валамі.
Ды ўсё босымі нагамі,
Сняжкі вочкі замятаюць,
К зямле ножкі прымярзаюць.

*Запісала А. Ю. Бурнэль у 1988 г.*

## ДЗЕ ТЫ, БУРЛАК, ВАЛАЧЫЎСЯ...

*Запісана ў в. Карпавічы*
*Светлагорскага раёна*
*ад М. К. Прус (1928 г. н.)*

Дзе ты, бурлак, валачыўся,
Што па пояс абмачыўся,
Э-ге-ге-гей, што па пояс намачыўся.

Гаем, гаем за таварам,
А лугамі за валамі,
Э-ге-ге-гей, а лугамі за валамі.

Шчэ ж бурлак не лажыўся,
А хазяін засвяціўся,
Э-ге-ге-гей, а хазяін засвяціўся.

— Уставай, бурлак, годзе спаці,
Пара сівы валы гнаці,
Э-ге-ге-гей, пара сівы валы гнаці.

Бурлак валы выганяе,
Слязьмі сцежку аблівае,
Э-ге-ге-гей, слязьмі сцежку аблівае.

## ПРЫЙШОЎ БУРЛАК НА КВАТЭРУ...

*Запісана ў в. Жылічы Клецкага раёна*
*ад А. С. Навумовіч (1921 г. н.)*

Прыйшоў бурлак на кватэру:
— Падай, хазяйка, вячэру.
— Я ў печы не тапіла,
Вячэраці не рабіла.
Аб тым бурлак не спужаўся,
Узяў сяннік ды паслаўся.
Яшчэ бурлак і не клаўся,
А ўжо гаспадар праспаўся.
— Уставай, бурлак, годзе спаці,
Пара ў поле валы гнаці.
Аб тым бурлак не спужаўся,
Узяў валы і пагнаўся.
Арэ бурлак, паганяе,
Сваю мамачку ўспамінае.

*Запісала А. Богдан у 1996 г.*

## АРЭЦЬ БУРЛАК...

*Запісана ў в. Кішча Барысаўскага раёна*
*ад А. М. Стрэльмашонак*

Арэць бурлак, баранує.
Кажуць людзі, што гультуе.
Ступай, бурлак, на квацеру.
— Давай, хазяйка, вячэру.
— Нечым бурцу прысаліці:
Няма солі ні драбінкі.
Няма хлеба ні скарынкі.
Ой, еш, бурлак, ды галушкі.
Лажыся спаць без падушкі.

Яшчэ бурлак не разуўся,
Ужо хазяін абачхнуўся.
— Пара, бурлак, уставаці.
Пара валоў выганяці.

Бурлак таму не ўпіраўся,
Узяў валы ды пагнаўся.
Валы мае бялявыя,
Ежце траву зялёную.
Валы мае вароныя,
Пейце ваду сцюдзёную,
Знайце службу бурлацкую.

Маць мая жа ты, родная,
Нашто мяне нарадзіла,
Горку долю ўдзяліла?

*Запісалі А. Афанасік, В. Барбур,*
*К. Давыдоўская*

## III. ЖОРСТКІ РАМАНС

Жорсткі раманс — гэта лірычна-драматычная песня аб падзеях, найчасцей звязаных з праблемамі любоўнага трохвугольніка. Вырашэнне канфлікту ў ім меладраматычнае: трагічная, часам недарэчная смерць гераіні (героя). Жорсткі раманс з'яўляецца адной з форм раманса як музычна-паэтычнага твора (нагадаем, што раманс у паэзіі — невялікі напеўны лірычны верш, пераважна пра каханне).

Жорсткі раманс на пачатку XX ст. прыходзіць на змену старой, класічнай баладзе, дадаючы ёй псіхалагічную матывацыю падзей і характараў. Адначасова «ў вусны рэпертуар нахлынула новае паводдзе балад, а іх цяжка размежаваць з жорсткім рамансам, які, як правіла, з'яўляецца іпастассю ўсё той жа балады»*.

Па сваёй сюжэтыцы і тэматыцы жорсткі раманс падобны да баладных песень пра нешчаслівае каханне, драматычныя ці трагічныя выпадкі ва ўзаемаадносінах паміж дзяўчынай і хлопцам. У большасці і лексічна, і вобразна-інтанацыйна жорсткія рамансы суадносяцца з т. зв. «новымі баладамі» — рускімі жорсткімі рамансамі («Маруся отравилась», «Как на кладбище Митрофаньевском», «Кирпичики»). Ім уласцівы таксама займальны змест, драматызм падзей, вастрыня інтымнай праблематыкі:

* *Померанцева, Э. В.* Баллада и жестокий романс // Русский фольклор : Проблемы художественной формы : сб. ст. В. 25 т. Т. 14 / Э. В. Померанцева. Л., 1974. С. 207.

каханне і рэўнасць, каханне і здрада, каханне і паклёп, каханне і трагічная смерць. Але заўсёды ў якасці першачынніку тут выступае матыў кахання. Без яго няма сюжэта, няма паўнацэннай мастацкай рэальнасці. Афектацыя, пэўная экзальтацыя ўчынкаў і пачуццяў герояў — характэрная якасць жорсткіх рамансаў.

Як адзначае даследчыца фальклору Э. В. Памяранцава, жорсткі раманс — «гэта квінтэсенцыя мяшчанскай этыкі і эстэтыкі, часта нізкапробнай, блатной экзотыкі» («Яна была прастытутка, а ён карманны вор»)*.

*Метадычныя рэкамендацыі.* Студэнту-практыканту, для таго каб правільна вызначыць жанр, трэба арыентавацца на наступныя вызначальныя рысы жорсткага раманса:

1) невырашальны характар канфлікту звязаны з матывам кахання і абумоўлены дэградацыяй маральнага стану грамадства;

2) найчасцей сюжэтная формула твораў гэтага жанру — «он ее любил, он ее и убил», хоць канцоўкай можа быць падман і растанне;

3) узнаўленне псіхалогіі маргінальнага асяроддзя, свету сучасных каштоўнасцей.

Нагадаем таксама, што жорсткія рамансы функцыянуюць у жывой маўленчай практыцы пераважна на рускай мове або на «трасянцы».

**Парада.** Больш падрабязную інфармацыю пра жорсткія рамансы вы можаце атрымаць, пазнаёміўшыся з даведачнымі выданнямі і спецыяльнымі даследаваннямі [5, 9].

Гістарычна жорсткі раманс — набытак гарадской культуры, аднак у другой палове XX ст. сфера яго бытавання пашырылася. На вёсцы, ды і ў горадзе пры запісе ад інфарманта назвы «жорсткі раманс» можна і не пачуць: і балады, і жорсткі раманс яны могуць назваць як «жаласлівыя песні» пра некага (нешта). Таму правільнае вызначэнне віду твора будзе залежаць ужо ад ведаў студэнтаў.

### ОЙ, ВЕЧАР ВЕЧАРЭЕ...

*Запісана ў в. Вялікая Баркоўшчына*
*Маладзечанскага раёна*
*ад С. М. Нехвядовіч (1917 г. н.)*

Ой, вечар вечарэе,
Прыказчыцы ідуць.
Маруся атравілася —
У бальніцу павязуць.

* *Померанцева, Э. В.* Баллада и жестокий романс // Русский фольклор : Проблемы художественной формы : сб. ст. В. 25 т. Т. 14 / Э. В. Померанцева. Л., 1974. С. 208.

Увозяць у бальніцу,
Паклалі на кравяць.
Два доктара й сястрыцы
Стараліс жызнь спасаць.
— Спасайце — не спасайце,
Мне жызнь не дарага.
Любіла я мілога,
Такога падлеца.
Прашу я вас, падружкі,
Як буду я ляжаць,
Прашу я вас, падружкі,
Мяне не асуждаць.
Прашу я вас, падружкі,
Звіце мне вянок
І з левае старонкі
Прыколіце цвяток.

*Запісала М. У. Канапацкая ў 1994 г.*

## КАГДА Я МЕЛА ЛЕТ 17...

*Запісана ў в. Міхневічы Смаргонскага раёна ад Л. М. Сапач* (*1929 г. н.*)

Кагда я мела лет 17,
Я не любіла нікаво.
А кагда стала 19,
Я палюбіла аднаво.
Ужасна я ево любіла,
Но й страсна он меня любіл.
Мы ажыдалі ў жызні шчасця
І ў брак законны паступіць.
Но маць ево не захацела
Нашага шчасця савершыць
І сыну строга прыказала,
Мяне, няшчасную, забыць.
Но сын не вынес той печалі,
В пасцелю лёг і болен стал,
І перад самаю канчынай
Он маць пазвал і ей сказал:
«Мама, мяне благаславіце
І з тэй, каторую люблю.
І наша шчасце савершыце,
Быць можэт, я йшчо пажыву».

Мама пазволіла, но позна,
Кагда канчыне прыйшоў час.
І он назвал её на імя,
І сам навек закрыл глаза.
Вот была чудная пагода,
Кагда друзья на кладбішча няслі,
І сквозь валністыя туманы
Всё прабіралася ана.
І кагда ўвідзела магілу,
На камень бросілась ана
І горка-горка плакаць стала,
І богу душу аддала.
— Не знал, не знал,
Што крэпка любіш,
Не знал, што ты будзеш мая.
Цяпер абое мы ў магіле,
Радная мама, чэраз цебя.

*Запісала Н. С. Баярскіх у 2007 г.*

## ГАЛЯ

*Запісана ў г. Маладзечна*
*ад С. І. Тумаш (1953 г. н.)*

В нядзелечку ранней парою
Сабраліся падружкі гуляць.
— Пайдзём, Галя, пайдзём, дарагая,
Цветы алыя ў лес сабіраць.

Доўга-доўга падружкі стаялі
І сматрэлі друг дружке ў глаза.
Вдруг у Галі із глаз пакацілась
Па букету горка сляза.

Відна, у Галачкі гора случылась,
Мужа ўзялі на фронт ваеваць.
Стала Галя па мужу печаліць,
Стала Галя па мужу скучаць.

А какой-та к ней прывязался
Безымяный Вася-сасед.
Вася пастучыць — і Галя адкрое,
Без разрашэння он к Гале войдзёт.

— Для цебя я всё ізгатовіл,
Для цебя я всё пакупіл,
Толька асталась ро́дную дочку,
Ро́дную дочку насмерць убіць.

Он падходзіт к краватке і смотріт,
А малютка ўсю ночку не спіт.
— Скажы, мама, скажы, дарагая,
Што за дзядзя на стуле сідзіт?

Залілася крывёю падушка,
Вынімает ана нож із грудзі.
— Будзь ты шчасліў, Вася, будзь ты весел
І пачашчэ ка мне прыхадзі.

І на эці дні разгавора
Хто-та громка ў дзверы пастучал.
— Адкрой, Галя, адкрой, дарагая,
Эта муж твой на отпуск прышоў.

Адкрывает кварціру і смотріт,
Узнаёт палажэнне жаны.
Стал іскаць сваю родную дочку
І нашол ўсю заліту ў краві...

Вынімает наган із кармана,
Настаўляет на іх абаіх,
І жане з палюбоўнікам мілым
Астаюцца кароткія дні.

После гэтага вышал на плошчадзь,
Перад грудай народа сказаў:
— Убірайце мяне за ўбійства,
Я за дочку іх пастрэлял.

*Запісала К. П. Койра ў 1995 г.*

## ТРУДНА, НУДНА НА СЭРДУНЬКУ...

*Запісана ў в. Завельцы Астравецкага раёна*
*ад Я. С. Ступенька (1921 г. н.)*

Трудна, нудна на сэрдуньку,
Як вечар падходзе,
Што мой мілай-мілюсенькай
Да другой уходзе.

Што мой мілай-мілюсенькай
Да другой уходзе.

Няхай ходзе, няхай любе
Дзяўчыну маладую.
Яна яму за жоначку
Будзе за другую.

Прыйшоў мілай з вечарынак,
Стаў ножык астрыці.
Жонка ў мужа пытаецца:
— Што будзеш рабіці?

— Не пытайся, жана мая,
Што я буду рабіць,
Толькі магі, жана мая,
Адну мінуту жыць.

— Не рэж, не рэж, мой міленькі,
Хоць эту мінутку.
Пазволь, пазволь падгадаваць
Малую Анютку.

— Тады будзе жонка мая
Аначку гадаваць,
Як я буду на рэчуньке
Свой ножык абмываць.

— Суседачкі, галубіцы,
Дайце маме знаці,
Няхай прыйдзе яна мяне
На смерць убіраці.

Дочка ж мая нешчасліва
Горку долю мае:
Учорай была ў госціках,
Сягодня ўмірае.
— Пахавайце мяне быстра,
Хоць за две гадзінкі,
Няхай муж мой
Гуляй з другой,
Бо ён маладзенькі.
Няхай муж мой
Гуляй з другой,
Бо ён маладзенькі.

*Запісаў К. А. Калабаў у 1998 г.*

## САДЗІСЯ, МІЛАЙ, У МАШЫНУ...

*Запісана ў в. Завельцы Астравецкага раёна*
*ад М. К. Рожка (1921 г. н.)*

Садзіся, мілай, у машыну,
Кандуктар дзверы закрываў.
А я крычу: «Куда ты едзіш,
А я астануся адна?»
А я крычу: «Куда ты едзіш,
А я завяну, как трава?»

— Забудзь, забудзь, мілая, свідання,
Забудзь з начала да канца.
Забудзь, як мы з табой улюблялісь,
Забудзь ты, мілая мая.

— Ну, как жэ я цябе забуду,
Кагда партрэт твой на сцяне?
Ну, как жэ я цябе забуду,
Кагда малютка на руцэ?

— Партрэт мой выбрась праз акошка,
Малютку ў дзецкі дом аддай.
Сама астанься сіратою
І пра мяне не ўспамінай.

*Запісаў К. А. Калабаў у 1998 г.*

## НА ГАРЫЗОНЦЕ ЗАРА ДАГАРАЕ...

*Запісана ў в. Астроўкі Нясвіжскага раёна*
*ад Я. Д. Корзан (1926 г. н.)*

На гарызонце зара дагарае,
І скрылся прэдгробный закат,
А на руках у сястры ўмірает
Краснабалційскі салдат.
І как тагда пад асколкам снарада
Раны яму наняслі.
І на яго жа ваеннай шынелі
Ціха ў палату ўняслі.
Врач падашол, пакачал галавою:
«Тут уж, — сказал, — не жылец.
Раны смярцельные вынесць не можэт,
Вот ужэ час і канец».

У белам хвартуке, абрызганым кроўю,
Ціха сястра падашла.
Яна ўзнала сваего брата,
Вдруг зарыдала тагда.
— Доктар, ай доктар, скарэе спасайце,
Эта едзінственный брат.
Слышыт он голас радной і знакомый,
Зашэвелілся марак:
— Зачэм ты, зачэм ты, зачэм ты рыдаеш?
Не нада, не нада рыдаць.
На свеце асталась людзей міліёны,
Каждый гатоў паміраць.
На гарызонце зара дагарает,
І скрылся прэдгробный закат,
А на руках у сестры ужэ умер
Краснабалційскі салдат.

*Запісала Н. М. Корзан у 1992 г.*

## НА КАКОМ-ТА НА ГЛАЎНЫМ ВАКЗАЛЕ...

*Запісана ў в. Астроўкі*
*Нясвіжскага раёна*
*ад Я. Д. Корзан* (*1926 г. н.*)

На каком-та на глаўным вакзале
Станцыённы там поезд стаіць,
А на лаўке пад серай шынеллю, } *2 разы*
Маладой афіцэрык стаіць.

Перад ім, апусцясь на каленях,
Стаіць дзева печальна й груснa.
Её очы наполнены слезою, } *2 разы*
Па плечах распусцілась каса.

— Не ўежай, не ўежай, друг мой мілый,
Не ўежай, не ўбі ты меня.
Вспомні нашэ то прэжне сіданье, } *2 разы*
Гаварыл: «Будзеш вечна мая».

— Веру, веру табе, дарагая,
Што па-прэжнему любіш меня.
Но я должэн паслушаць начальства, } *2 разы*
І на врэмя аставіць цебя.

Вот і поезд к вакзалу падходзіт,
Пасажырскій сігнал падаёт.
Афіцэр сваю Нюру брасает,
Сам паспешна к вагону ідзёт. } *2 разы*

А ў вагоне яму не сядзіцца,
Жаль ему Нюры радной.
Нюра в этай дурацкай машыне
Пад калёса лягла галавой. } *2 разы*

В этат дзень в этам самам вагоне
Мёртвый труп афіцэра нашлі.
Так пагібла два юнага сэрца
Ад какой-та праклятай любві. } *2 разы*

*Запісала Н. М. Корзан у 1992 г.*

## ДЛЯ ВСЕХ СЕГОДНЯ ДЗЕНЬ ВЕСЁЛЫЙ...

*Запісана ў в. Бор Навагрудскага раёна*
*ад Т. Ю. Чамерка (1929 г. н.)*

Для всех сегодня дзень весёлый,
А для меня одна тоска.
Мілый венчаецца з другой,
А я асталася адна.
Пасцель паслала, дзвер закрыла,
Толька агонь згасіць.
З пасцелі ўстала, дзвер адкрыла —
Мілый за ручэньку меня.
— Пачэму так рана спаць лажышся,
Пачэму на музыку не шла?
— Ты вон, мілый, з-пад маей хаты,
Ты багацтвам задаёшся, а я бедна́.
— Хоць ты, міла, мяне ругаеш,
Я ўсёраўно цябе люблю.
Пайдзём жа, мілка, пагуляем
На тот тоненькій масток
І звяжам рукі чорнай лентай.
На заўтра рана, чуць святочэк,
Ўсе ў поле ужэ ідут,
А адну малодзенькую пару
Хараніць нясут.

Пускай пасадзяць дзве бярозкі:
Адну ў галовах, адну ў нагах.
Кагда схіляцца бярозкі,
Будут людзі гаварыць,
Што па смерці іх любоў звяла.

*Запісала І. М. Ліннік у 2000 г.*

## КАРЫ ГЛАЗКІ, ГДЗЕ ВЫ СКРЫЛІСЬ?..

*Запісана ў в. Бор Навагрудскага раёна*
*ад Т. Ю. Чамерка* (*1929 г. н.*)

Кары глазкі, гдзе вы скрылісь,
Што вас большэ не відаць?
Гдзе вы скрылісь, удалілісь,
Меня заставілі страдаць.
Я страдала днём і ноччу,
Страдаць буду, цяжка мне.
Цебя, мілый, не забуду,
В какой бы ні был старане.
Пайду з гора ў чыста поле,
В дрымучый, цёмный лес.
Закрычу я шыбка громка,
Зверы люты сазаву.
Ой, вы, зверы, маі зверы,
Зверы лютые маі,
Расцерзайце маё цела,
Выньце серца із грудзі.
Выньце серца, аднясіце
Другу міламу маему.
Пусць мілый глянет — ужаснёцца,
Быць можэт, вспомніт аба мне.

*Запісала І. М. Ліннік у 2000 г.*

## БЫЛА Я Ў АТЦА НЕНАГЛЯДНАЯ ДОЧ...

*Запісана ў в. Уселюб Навагрудскага раёна*
*ад В. І. Кісляк* (*1926 г. н.*)

Была я ў атца ненаглядная доч,
І доч ненаглядная бежала
Ў асеннюю цёмную ноч.

Бежала я лесам дрэмучым,
Бежала я рошчэй густой,
Бежавшы, на неба взглянула
І вспомніла я дом свой радной.
На што мне зелёная рошча,
На што мне і свет галубой.
Как вспомню я мілага рэчы,
Зальюся я горкай слязой.
Дзесятак каробачэк спічэк
В халоднай вадзе разведу,
Стакан у краваці пастаўлю,
На серцэ атраву прыму.
Атрава мая недарагая,
Ана всево стоіт пятак,
А жызнь распраклятая, злая
Пускай прападает за так.

*Запісала І. М. Ліннік у 2000 г.*

## ПА ЦЁМНЫМ АЛЕЯМ ГУЛЯЛІ...

*Запісана ў в. Уселюб Навагрудскага раёна*
*ад В. І. Кісляк (1926 г. н.)*

Па цёмным алеям гулялі
З табою, мой мілы, вдваём.
Нас цёмные ветві скрывалі
І зналі ані аба всём.
В цішы ты меня пріласкаеш,
В цішы называеш сваею.
В народзе меня ізбегаеш,
Савсем я стаю в старане.
Гуляй, веселіся, насмешнік,
Судзьба пакарает цебя.
А я атамшчу за насмешку,
Любві не найдзёш нікагда.
Кагды ты, мой мілый, прыедзеш,
Кагда ты дружыну збярош?
Кагда ты меня, маладую,
К законнаму браку сведзёш?
— У пятніцу рана прыеду,
В суботу дружыну сберу,
В недзелю цебя, маладую,
К законнаму браку сведу.

— Не шыйце мне белага плацья,
Я з мілым к венцу не пайду.
Пашэйце мне жолтага цвета,
Я з мілым разлуку беру.
Падружкі, прашу, прыхадзіце,
Как буду я валь нашываць.
Ешчо вас прашу, прыхадзіце,
Как буду я в гробе лежаць.
Жолтая роза — разлука,
Красная роза — любовь,
Розавая роза — нешчасцье,
Бела — обліта слезой.
Не бейце вы гроба гвоздзямі,
Бо буду по мілым скучаць.
Не ройце мне яму глубокай,
Бо будзет мне сыра лежаць.

*Запісала І. М. Лінnік у 2000 г.*

# IV. ЖАРТОЎНА-ГУМАРЫСТЫЧНЫЯ І САТЫРЫЧНЫЯ ПЕСНІ

Гэта група рознажанравых песень вылучаецца па эстэтычным прынцыпе. Значная іх частка ўваходзіць у склад каляндарна- і сямейна-абрадавай паэзіі, не ствараючы, аднак, асобных разнавіднасцей. Вось чаму даследчыкі і падкрэсліваюць старажытны, старадаўні характар дадзенай групы твораў, прымяркоўваюць час іх узнікнення да перыяду фарміравання беларускай народнасці.

Грамадская функцыя гумарыстычных (жартоўных) песень абумоўлена асаблівасцямі іх прызначэння і бытавання. Перш за ўсё яны заклікаваны стварыць пэўны настрой, захапіць слухачоў, перадаць весялосць, заклікаць да забавы. Але існуе і пэўная колькасць твораў, створаных аўтарамі-выканаўцамі для сябе, якія выконваюць інтымную функцыю і не вымагаюць публічнай аўдыторыі («Хлопец пашаньку пахае...»).

Асноўная тэматыка жартоўна-гумарыстычных песень, якія складаюць у беларускім фальклоры адну групу, — сямейна-бытавыя адносіны паміж іх традыцыйнымі персанажамі: мужам і жонкай, дзедам і бабай, зяцем і цешчай, нявесткай і свекрывёю, хлопцам і дзяўчынай.

Прадмет высмейвання ў жартоўна-гумарыстычных песнях — не зусім нармальныя, нездаровыя ўзаемадачыненні, адмоўныя, заганныя рысы

характару: лянота, сквапнасць, здрадніцтва, хітрасць, п’янства, усялякае дзівацтва, а таксама некаторыя фізічныя слабасці (непамерна мажная, тоўстая баба ці жонка і адпаведна нямоглы, нягеглы дзед ці муж).

Колькасна меншай падгрупай прадстаўлены творы сатырычнай накіраванасці, дзе аб’ектам выкрыцця з’яўляюцца заганы пераважна сацыяльнага зместу: песні антыпанскія, антыклерыкальныя, антыбюракратычныя і да т. п.

Сярод моладзі найбольшай папулярнасцю карыстаюцца жартоўна-гумарыстычныя песні любоўнага зместу, у якіх праступае мяккая, нязлосная ўсмешка над няўмелымі заляцаннямі хлопцаў, какецтвам дзяўчат, над жаніхом і нявестай.

Для фармальна-паэтычнай структуры беларускіх жартоўна-гумарыстычных песень характэрны самыя розныя выяўленчыя сродкі: завастрэнне, гіпербалізацыя вобразаў, шырокі зварот да гумару, іроніі, сарказму, гратэску.

Своеасаблівай, спецыфічнай рысай айчыннага фальклору з’яўляецца аўтаіронія — смех з сябе, часам смех скрозь слёзы. Паэт і фалькларыст Н. С. Гілевіч ілюструе гэты вельмі перспектыўны мастацкі прыём на прыкладзе класічнага твора «Чаму ж мне не пець» і цытуе яшчэ некалькі менш вядомых песень. Так, паводле адной з іх, муж перад смерцю суцяшае жонку, што ён пакідае такую-та спадчыну: «Па маёй галаве застанецца ўсё табе: і таўкач, і мялён, і старожа, і прыгон». Даследчык з горыччу каменціруе: «У спадчыну, такім чынам, перадаецца не толькі “агромністае багацце” — таўкач і жорны, але і сама крыніца гэтага багацця — прыгон»*.

Цікавая падгрупа — песні недарэчнага, алагічнага зместу, так званыя «небыліцы». Персанажы ў іх пастаўлены ў фантастычныя абставіны, з імі здараюцца розныя цуды. Лічыцца, што такія творы ў старажытнасці мелі магічнае значэнне і выказвалі наіўныя сялянскія ўтапічныя ўяўленні аб свеце, дзе няма гвалту і несправядлівасці, дзе можна «пабываць на небе і паесці ўволю». Сустракаюцца жартоўныя творы эратычнага зместу.

Падсумоўваючы сказанае вышэй, адзначым асноўныя тэматычныя падгрупы беларускіх жартоўна-гумарыстычных і сатырычных песень, зафіксаваных навуковымі рэдактарамі і ўкладальнікам (а таксама аўтарам прадмовы) І. К. Цішчанкам у томе «Жартоўныя песні» са Зводу БНТ:

1. Гора, бяда. Антыпанскія і антыклерыкальныя творы.

2. Хлапечыя і дзявочыя заляцанні; лянівая дзеўка; каханне хлопца; сва́ты; жаніцьба; жонка-няўдаліца; не такі муж, як хацела; лютая свякроў і лянівая нявестка.

---

* *Гілевіч, Н. С.* Наша родная песня / Н. С. Гілевіч. Мінск, 1968. С. 163.

3. Сямейны лад і непаладкі: лянівая жонка, жонка гуляе, у карчме выпівае, муж-няўдаліца, п'яніца, стары муж; гулі; кум ды кума, зяць і цешча, пра дзеда і бабу.

4. Былі і небыліцы: пра жывёл і птушак, неверагодныя гісторыі, вясёлыя музыкі.

**Парада.** Пры запісе жартоўных песень побач з вызначаным відам указвайце тэматычную разнавіднасць песні, напрыклад: жартоўная песня пра хлапечыя заляцанні, пра лянівую жонку, пра насякомых і г. д.

Каб лепш пазнаёміцца з жартоўна-гумарыстычнымі і сатырычнымі песнямі, вы можаце звярнуцца да спецыяльных выданняў, прысвечаных дадзеным разнавіднасцям пазаабрадавай песні [5, 8, 9, 19].

### БАБА ДЗЕДА ШАНАВАЛА*...

*Запісана ў в. Пагарэльцы*
*Нясвіжскага раёна*
*ад Н. І. Александровіч* (*1924 г. н.*)

Баба дзеда шанавала,
На папары навязала.
— Еш, дзед, траву палявую,
Пі вадзіцу лугавую:
Палявая трава сытна,
Лугавая вада спітна.

*Запісала Г. М. Мякіннік у 2007 г.*

### БАЦЬКА ДОМА РАБОТАЕ...

*Запісана ў в. Пагарэльцы*
*Нясвіжскага раёна*
*ад С. М. Шчурэвіч* (*1938 г. н.*)

Бацька дома работае,
Сын у Піцеры жыве,
Бацька грошы дажыдае,
Сын ў апорачнях ідзе.
— Охты, бацюхна радной,
Не з чым ехаць мне дамой.

---

*Варыянт вядомай песні (Звод БНТ : Жартоўныя песні. С. 194).

Прадай, бацюхна, карову,
Прышлі грошай на дарогу.
Прадай, матухна, курэй,
Прышлі грошы паскарэй.
Прадай, братухна, казу,
Я гармошку прывязу.

*Запісала Г. М. Мякіннік у 2007 г.*

## ДВА ГАРОДЫ АБРАБІЛА...

*Запісана ў в. Мешычы Стаўбцоўскага раёна ад Г. А. Вярбіцкай* (*1947 г. н.*)

Два гароды абрабіла —
Адна дыня ўрадзіла.
Гуляю я, гуляю я, эх, гуляю я!
Як павезла прадаваці,
Ды не знаю, што ўзяці.
Гуляю я, гуляю я, эх, гуляю я!
Пакуль людзі цэну далі,
Дык цыганы дыню ўкралі.
Гуляю я, гуляю я, эх, гуляю я!
Пакуль у печы запаліла,
Свіння дзверы пракусіла.
Гуляю я, гуляю я, эх, гуляю я!
Пакуль дзверы залатала,
Дык дзіця з печы ўпала.
Гуляю я, гуляю я, эх, гуляю я!
Куры хату замятаюць,
Хлопцы ў вокны заглядаюць.
Гуляю я, гуляю я, эх, гуляю я!
Не глядзіце — няма на́ шта,
Хоць красіва, ды лянiва.
Гуляю я, гуляю я, эх, гуляю я!

*Запісала Т. С. Астапук у 2007 г.*

## АЖАНІЎСЯ СТАРЫ ДЗЕД...

Ажаніўся стары дзед,
Узяў дзеўку дваццаць лет.
Ой-да, ой-да, ой-да-даль.
Узяў дзеўку дваццаць лет.

Толькі класціся ўжо спаць —
Маладзіцы не відаць.
Ой-да, ой-да, ой-да-даль
Маладзіцы не відаць.

— Ты пагрэй, дзед, трохі спінку,
А я выйду на хвілінку.
Ой-да, ой-да, ой-да-даль
А я выйду на хвілінку.

За дзвярмі чакаў каваль.
Цалаваліся на ганку,
Дзед на печы спаў да ранку.
Ой-да, ой-да, ой-да-даль,
Дзед на печы спаў да ранку.

Не жаніцеся, дзяды,
Кабы не было бяды!
Ой-да, ой-да, ой-да-даль,
Кабы не было бяды!

*Запісала І. Р. Лагеня ў 2006 г.*

## ЗВАЛІЛАСЯ БАБА З НЕБА...

*Запісана ў в. Ячава Слуцкага раёна*
*ад В. К.Варывончык (1932 г. н.),*
*М. А. Пупкевіч (1932 г. н.),*
*З. П. Клека (1943 г. н.),*
*Н. В. Троцкай (1938 г. н.)*

Звалілася баба з неба,
Нам такая баба трэба.
Адкуль яна ўзялася?
З яе гу́льня пачалася.
Пайшла баба на бяседу
Дай згубіла торбу з хлебам.
Пайшла баба шукаць хлеба,
Дай згубіла свайго дзеда.
— Лепш бы хлеба я не ела,
А дзядочка свайго мела.
Ой, дзядочак, мой дзядочак,
Адзавіся, галубочак.

*Запісала Н. В. Сарокіна ў 2006 г.*

## ЯК ПАЙДУ Я ПАГУЛЯЮ

*Запісана ў в. Ячава Слуцкага раёна*
*ад З. П. Клека (1943 г. н.)*

Як пайду я пагуляю,
Як рыбачка па Дунаю.
Туды-сюды павярнуся —
Я й нікога не баюся.
Прывязала мужыка к криваці —
Заўтра павяду прадаваці.
А што ж людзі ўцануюць:
Ці тры рублі залатыя,
Ці тры кані вараныя?
Мне з грашамі не насіцца,
Мне з канямі не вадзіцца,
Мне самой мужычок знадабіцца.
Як пайду я пагуляю,
Як рыбачка па Дунаю.

*Запісала Н. В. Сарокіна ў 2006 г.*

## ЖОНКА МУЖА ЗНАРАВІЛА*...

*Запісана ў в. Казловічы Слуцкага раёна*
*ад С. І. Светаш (1925 г. н.)*

Жонка мужа знаравіла,
Тры дні ў печы не тапіла:
— Мая печ акалела —
Няма дроў ні палена.
Жонка мужа запрагае,
У лес па дровы выязджае.
Пад'язджае да лесу:
— Тпру, стой, бо павешу!
Сама дровы насякае,
Воз вялікі накладае.
Сама дровы насякае,
Воз вялікі накладае.
Пад гару сама сядае:
— Цягні, муж, не ўпірайся,
На мяне не спадзявайся!

*Варыянт вядомай песні (Звод БНТ : Жартоўныя песні. С. 196).

А вы, хлопцы, тое знайце:
Вы з пасагам не шукайце!
Хто з пасагам жонку мае,
На гарбу дровы цягае.

*Запісаў Ф. С. Палякоў у 2005 г.*

## ШТО Ж ТЫ, ДЗЕЎКА, РОБІШ?

*Запісана ў в. Казловічы Слуцкага раёна*
*ад Н. В. Троцкай (1938 г. н.)*

Самым першым із сямёх
Сватаўся ка мне Цімох.
У панядзелак ён прыйшоў —
Ні кашулі, ні штаноў!

*Прыпеў*:
Што ж ты, дзеўка, робіш?
Ты ж усіх пагоніш!
Адна застанешся,
Тады пасмяешся.

А Мікіта ў аўторак
Цалаваў разоў сто сорак.
За Мікіту не пайду,
Можа, лепшага знайду.

*Прыпеў*:
Што ж ты, дзеўка, робіш?
Ты ж усіх пагоніш!
Адна застанешся,
Тады пасмяешся.
А ў сярэду прыйшоў Грыша,
Але неяк цяжка дыша.
Ён хацеў мяне абняць,
Ды не змог ніяк дагнаць.

*Прыпеў*:
Што ж ты, дзеўка, робіш?
Ты ж усіх пагоніш!
Адна застанешся,
Тады пасмяешся.

У чацвер жа на дыване
Прызнаваўся шчыра Ваня.
Ёсць і качкі, і пятух,
Толькі ж ён зусім лапух!

*Прыпеў*:
Што ж ты, дзеўка, робіш?
Ты ж усіх пагоніш!
Адна застанешся,
Тады пасмяешся.

А ў пятні́цу раніцой
Я хадзіла за вадой.
Пераняў мяне Яўхім,
Толькі ж лысы ён зусім.

*Прыпеў*:
Што ж ты, дзеўка, робіш?
Ты ж усіх пагоніш!
Адна застанешся,
Тады пасмяешся.

А ў суботу ля варот
Сустракаў мяне Фядот.
Спрабаваў пацалаваць,
Ды не змог ніяк дастаць.

*Прыпеў*:
Што ж ты, дзеўка, робіш?
Ты ж усіх пагоніш!
Адна застанешся,
Тады пасмяешся.

А ў нядзелю вечарком
Сеў на лавачку Пахом.
Гаварыў мне пра любоў.
Толькі што ж ён без зубоў?

*Прыпеў*:
Што ж ты, дзеўка, робіш?
Ты ж усіх пагоніш!
Адна застанешся,
Тады пасмяешся.

Замуж выйсці — трэба знаць:
Позна легчы, рана ўстаць.
А я замуж не пайду,
Пакуль любага знайду.

*Прыпеў*:
Што ж ты, дзеўка, робіш?
Ты ж усіх пагоніш!
Адна застанешся,
Тады пасмяешся.

*Запісаў Ф. С. Палякоў у 2005 г.*

## ЯК Я МОЛАДА БЫЛА І КРАСІВА...

*Запісана ў в. Падліпцы Слуцкага раёна*
*ад В. А. Амяльчэні* (*1930 г. н.*)

Як я молада была і красіва,
Весяліцца і плясаць я любіла.
Піла чарку за дваіх
І плясала за траіх,
Заўлякаць мужчын чужых я любіла.
Плацце новае сваё надзяваю,
Бровы рыжыя дугой начарняю,
Губы краскай навяду,
Яшчэ цені падвяду
І парык на галаву надзяваю.
За вароты выхажу, абражаю,
Звысака я на мужчын паглядаю.
Яны ўслед за мной глядзяць,
Глаз не могуць адарваць,
Усамаволку ад сваіх жон ўздыхаюць.
Прычапіўся да мяне паўнаваты,
Сказаў: «Павяду цябе я дахаты».
Я дахаты ісці не згаджуся,
У рэстаране пасядзець не адкажуся.
У рэстаране мы з ім доўга курылі,
Віно, водачку, каньяк мы з ім пілі.
А як выйшла на парог,
Мае ногі, як назло,
Проста скошаныя і падламіліся.
А назаўтра паутру што случылась,
Як жа я тут пад заборам ачуцілась?

Сама боса, гразь на мне,
І парык у старане.
Паняла: за рэстаран расплацілась.
Цяпер дома я сяджу, слёзы льюцца,
Пасівелі валасы і не ўюцца.
Ох, як успомню ўсе дзяла,
Як я молада была,
Толькі сэрца і душа не здаюцца.

*Запісаў Ф. С. Палякоў у 2005 г.*

## МНЕ МІЛЫ ІЗМЯНІЎ...

*Запісана ў в. Плянта Салігорскага раёна ад Л. І. Кулевіч* (*1927 г. н.*)

Мне мілы ізмяніў,
Як калёса на хаду,
А я яго тожа
Да чахоткі давяду.
Мне мілы ізмяніў:
— Дарагая мая мілка,
Лепш цябе я не знайшоў.
— Ізмяняй мне, мой мілы,
Ізмяняй да ты хутчэй.
Ізмянімая дзяўчына
Дый гуляе весялей.
Дуб зялёны, дуб зялёны,
Зялёныя лісты.
Адаб'ю, не пасцясняюсь,
Ухажора ад сястры.
На стале стаяць вазоны,
Сюды-туды гнуцца.
Мне і ў 25 гадоў жаніхі найдуцца.

*Запісала Н. У. Карнажыцкая ў 2007 г.*

## ОЙ, ХАЦЕЛА Ж МЯНЕ МАЦЬ...

*Запісана ў в. Завітая Нясвіжскага раёна ад Л. А. Ільюшэнка* (*1963 г. н.*)

Ой, хацела ж мяне маць
За Рыгора замуж даць.
А ў Рыгора многа гора,
Людзі скажуць, што я хвора.

Не хачу, не пайду, я Рыгора не люблю.
Ой, хацела ж мяне маць
За Данілу замуж даць.
А ў Данілы многа нівы,
Людзі скажуць, што ляніва.
Не хачу, не пайду, я Данілу не люблю.
Ой, хацела ж мяне маць
За Панаса замуж даць.
У Панаса многа мяса,
Людзі скажуць, што я ласа.
Не хачу, не пайду, я Панаса не люблю.
Ой, хацела ж мяне маць
За мельніка замуж даць.
Мельнік меле і пытлюе,
Адвярнецца, пацалуе,
Мельнік шапкай патрасе,
Ой, хачу, ой, люблю,
Ой, за мельніка пайду!

*Запісала В. У. Лыскавец у 2007 г.*

## ГАРАДСКАЯ НЕ ТАКАЯ...

*Запісана ў в. Завітая Нясвіжскага раёна*
*ад Л. А. Ільюшэнка (1963 г. н.)*

Тры таполі каля дуба
І адна асіна.
Палюбіла трактарыста
Модніца-дзяўчына.
Выйшла замуж за Івана
Гарадская Маша.
Як да печы падышла,
Падгарэла каша.

*Прыпеў*:
«Гарадская не такая», — кажуць у народзе.
Трэба жонку браць не ў клубе, а ў гародзе.

Пасадзіла буракі
Роўненька і густа.
Цераз месяц як зірнула —
Вырасла капуста.

А як грэбла ў лузе сена
Ды на граблі стала —
Бінтаваць пабіты лоб
Скорая забрала.

*Прыпеў*:
«Гарадская не такая», — кажуць у народзе.
Трэба жонку браць не ў клубе, а ў гародзе.

Як пайшлі даіць карову,
Не сагнула спіну,
Дзень лавілі ля сяла
Рыжую Мальвіну.
Тры тапалі каля дуба
І адна асіна.
Не бярыце, хлопцы, ў жонкі
Гарадскіх дзяўчынак.

*Прыпеў*:
«Гарадская не такая», — кажуць у народзе.
Трэба жонку браць не ў клубе, а ў гародзе.

*Запісала В. У. Лыскавец у 2007 г.*

## ЖЫЎ-БЫЎ У БАБУШКІ КАЗЁЛ...

*Запісана ў в. Мікалаеўшчына*
*Стаўбцоўскага раёна*
*ад М. М. Скарабагатага* (*1925 г. н.*)

Жыў-быў у бабушкі казёл,
Казёл шэранькі, белашэенькі.
Ён у стойле стаяў,
Муку, сена паядаў.
Муку сеяную, перасеяную,
Сена кіданае, перакіданае.
Ту-ру-ру, ту-ру-ру.
Аддаў бы ўсё, што ёсць,
Каб назад вярнулась маладосць.
Аддаў бы ўсё, што ёсць,
Каб назад вярнулась маладосць.

*Запісала Т. М. Левашэвіч у 2006 г.*

# V. ПРЫПЕЎКІ

Прыпеўка (у залежнасці ад рэгіёна — *частушка*, *прыпеў*, *папеўка*, *падпявалка*, *скакуха*, *плясуха*, *круцёлка*, *дрындушка*, *таптушка* і інш.) — невялікі па аб'ёме лірычны твор гумарыстычна-сатырычнага, сацыяльнага, любоўнага, бытавога зместу; разнавіднасць пазаабрадавага песеннага фальклору. Тэкст прыпеўкі аднастрофны, складаецца з 4—6 радкоў, спяваецца на пэўную мелодыю, часта выконваецца як прыпеў да танца («Лявоніха», «Базар», «Шастак», «Кракавяк» і інш.). Прыпеўкі могуць спявацца сола, дуэтам, хорам, салістам і хорам. Падзяляюцца на «мужчынскія», «жаночыя», а таксама тыя, што могуць выконвацца абодвума бакамі.

Па тэматычнай дамінанце прыпеўкі падзяляюцца на *сацыяльныя*, *гумарыстычныя*, *сямейныя*, *любоўныя*, *любоўна-эратычныя*, *да танцаў*. Пры гэтым цалкам магчыма накладанне дзвюх і болей тэм у адным творы. Хоць прыпеўкі адносяцца да пазаабрадавай творчасці, яны маглі выконвацца і падчас некаторых абрадаў, напрыклад, вяселля або хрэсьбін.

Прыпеўкі — самы прадуктыўны песенны жанр. У адрозненне ад іншых разнавіднасцей песеннага фальклору прыпеўкі вызначаюцца «аператыўнасцю» рэагавання на змены жыцця. Яны амаль імгненна адгукаюцца на ўсякую новую з'яву, даючы ёй сваю ацэнку, пры якой важную ролю адыгрываюць гумар і іронія. Сёння прыпеўкі можна запісаць і на рускай мове.

**Парада.** Пры запісе прыпевак звяртайце ўвагу на якасць гумару і паэтычнай вобразнасці, на мастацкасць твора. Пры вызначэнні віду ўказвайце не толькі «прыпеўка», але і яе тэматычную разнавіднасць, напрыклад, «прыпеўка пра каханне хлопца да дзяўчыны», «прыпеўка пра мужа-п'яніцу», «палітычная прыпеўка» і інш.

Для больш падрабязнага знаёмства з гэтай разнавіднасцю пазаабрадавай песні вы можаце звярнуцца да спецыяльных даследаванняў і зборнікаў прыпевак [1, 5, 7, 24, 37, 40].

## ПРЫПЕЎКІ ЛЮБОЎНЫЯ

### МАЯ МІЛКА ЧАРНАБРЫЎКА...

*Запісана ў в. Чорны Бор Быхаўскага раёна*
*ад Н. Д. Лахадынавай* (*1935 г. н.*)

Мая мілка чарнабрыўка,
Яна любя каўбасу.
А я хлопец не лянівы —
Кожны вечар паднясу.

*Запісала Д. І. Чачко ў 2008 г.*

## МЯНЕ МІЛЫ ПРАВАЖАЎ...

*Запісана ў в. Чорны Бор Быхаўскага раёна*
*ад Н. Д. Лахадынавай (1935 г. н.)*

Мяне мілы праважаў,
Пень бярозавы абняў.
Думаў у кохці розавай —
Гэта пень бярозавы.

*Запісала Д. І. Чачко ў 2008 г.*

## ЛЮБЛЮ ТОЕ ЖЫТА ЖАЦЬ...

*Запісана ў в. Траянаўка Барысаўскага раёна*
*ад В. А. Салаўёвай (1953 г. н.)*

Люблю тое жыта жаць,
Дзе бальшыя каласы.
Люблю тога ўхажора,
Што падкручаны вусы.

*Запісала А. У. Кісліцына ў 2008 г.*

## МЯНЕ МІЛЫ ЦАЛАВАЎ...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна*
*ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Мяне мілы цалаваў,
К плоціку прыціснуў.
У кармане быў траяк,
Ён яго і свіснуў.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## ШТО ЗА Я...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна*
*ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Што за я, што за я,
Што за масцярыца.
Шыла міламу штаны —
Выйшла рукавіца.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## МОЙ МІЛЁНАК ХУДАШЧАВЫ...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Мой мілёнак худашчавы
І ад ветру гнецца.
Прывяжу на канюшыне,
Можа, адпасецца.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## ДАРАГІЯ ДЗЕВАЧКІ...

*Запісана ў в. Вожыкі Мінскага раёна ад Г. В. Клімантовіч (1937 г. н.)*

Дарагія дзевачкі,
Не бойцеся ізменачкі!
Яе цяжка пераджыць
Усяго дзве нядзелечкі.

*Запісала А. Ю. Якубік у 2008 г.*

## ЧАМУ, МІЛЫ, НЕ ПРЫЙШОЎ?..

*Запісана ў в. Цярэшкі Ваўкавыскага раёна ад В. Б. Астасевіч (1936 г. н.)*

Чаму, мілы, не прыйшоў?
Ці штаны ты не знайшоў?
Хоць бы дзедавы надзеў —
Дзед на печы б пасядзеў.

*Запісалі Т. Бурнос, І. Грыгель у 1997 г.*

## ЧЭРАЗ РЭЧКУ БЫСТРУЮ...

*Запісана ў в. Пузыры Мядзельскага раёна ад Г. В. Жураўскай (1913 г. н.)*

Чэраз рэчку быструю
Я масточак выстраю —
Хадзі, мілы, хадзі, мой,
Хадзі летам і зімой.

*Запісала С. У. Мычко ў 1993 г.*

### НЕ ГЛЯДЗІЦЕ НА ДЗЯЎЧАТ...

*Запісана ў в. Забалацце Карэліцкага раёна ад Д. Я. Ціхановіч (1952 г. н.)*

Не глядзіце на дзяўчат,
Што ў дзяўчат за брошкі,
А вазьміце паглядзіце,
Ці памыты ножкі.

*Запісалі С. Г. Крук, І. І. Камароўская ў 1991 г.*

## ПРЫПЕЎКІ ЛЮБОЎНА-ЭРАТЫЧНЫЯ

### СУСЕД ТЫ МОЙ...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Сусед ты мой,
Я твая суседка.
У цябе ёсць уключацель —
У мяне рызетка.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

### ПАЛЮБІЛА — ЦЯПЕР КАЮСЬ...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Палюбіла — цяпер каюсь,
Аказаўся ён связіст.
У яго нашчот любові
Правада павіслі ўніз.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

### ПРЫГЛАСІЎ МЯНЕ МІЛЁНАК...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Прыгласіў мяне мілёнак
Палапаціць на таку.
Я прыйшла — ў яго гармошкай
І схаваны ў хмызняку.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## ОЙ, ДАЙ, НЕ ГАДАЙ...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад М. М. Клімашонак (1934 г. н.)*

Ой, дай, не гадай
Мне баранак макавай,
А то варона склюе
Дзюбай абыякавай.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## МІЛЫ ВАТНІКІ НАДЗЕЎ...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад М. М. Клімашонак (1934 г. н.)*

Мілы ватнікі надзеў,
Падвязаў вяроўкай.
І крата свайго схаваў
З лысаю галоўкай.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## Я З ГРУЗІНАМ САГРАШЫЛА...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Я з грузінам саграшыла,
Абманулась крэпка.
Аказалась, у яго
Ліш бальшая кепка.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## МАЛАДАЯ КУРЫЦА...

*Запісана ў г. Дзятлава ад М. Д. Бабко (1923 г. н.)*

Маладая курыца
Усё да плоту туліцца,
А старая квохча —
Ніхто яе не топча.

*Запісала Т. Л. Савань у 1996 г.*

## ПРЫПЕЎКІ ГУМАРЫСТЫЧНЫЯ

### ДЗЕВАЧКІ, ДЗЕВАЧКІ...

*Запісана ў в. Людкова Быхаўскага раёна ад А. У. Булгак (1931 г. н.)*

— Дзевачкі, дзевачкі,
Дзе вы пабяліліся?
— На лузе кароў даілі,
Сырадоем мыліся.

*Запісаў І. В. Нікіценка ў 2005 г.*

### А Ў СЛУЦКУ НА БАЗАРЫ...

*Запісана ў в. Дараганава Асіповіцкага раёна ад П. І. Качаноўскай (1935 г. н.)*

А ў Слуцку на базары
Прадаюць мужчын вазамі.
Адна баба ўсіх любіла —
За капейку ўсіх купіла.

*Запісалі У. М. Дзяткоўскі, І. В. Юрэвіч, Э. В. Дуброўкіна ў 1992 г.*

### МЯНЕ СВАТАЦЬ ПРЫЯЗЖАЛІ...

*Запісана ў в. Цярэшкі Ваўкавыскага раёна ад В. Б. Астасевіч (1936 г. н.)*

Мяне сватаць прыязжалі
На сівой кабыле —
Усё прыданае забралі,
А мяне забылі.

*Запісалі Т. Бурнос, І. Грыгель у 1997 г.*

### КУПІМ КОЗУ ДЛЯ КАЛХОЗУ...

*Запісана ў г. Баранавічы ад В. С. Коўш (1937 г. н.)*

Купім козу для калхозу,
Брыгадзір будзе даіць.
Прадсядацель захварэе —
Будзем малаком паіць.

*Запісала А. Р. Столяр у 1991 г.*

## ТЫ ЛЯЦІ, МАЯ ПРЫПЕЎКА...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Ты ляці, мая прыпеўка,
Тонкая і звонкая.
Хоць я сто гадоў не дзеўка,
Дык затое ёмкая.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## ГАВАРАТ, ШТО Я СТАРАЯ...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад М. М. Клімашонак (1934 г. н.)*

Гаварат, што я старая,
Толькі мне ня верыцца.
Ну якая ж я старая —
На мне ўсё шавеліцца.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## Я І ТАК, Я І СЯК...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад М. М. Клімашонак (1934 г. н.)*

Я і так, я і сяк,
Я і ногі на касяк,
Я і цыцкі напярод,
Да ніхто замуж не бярот.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## СЫРЫ АВЁС, СЫРЫ АВЁС...

*Запісана ў в. Грабучае Докшыцкага раёна ад Я. Ф. Палачанінай (1944 г. н.)*

Сыры авёс, сыры авёс —
Не малоціцца.
Пастарэлі нашы дзеўкі,
Аж калоцяцца.

Сыры авёс, сыры авёс —
Ды не мелецца.
Пастарэлі нашы хлопцы
Ды не жэняцца.

*Запісалі І. М. Бахановіч,*
*Н. В. Бадун у 1991 г.*

## ПРЫПЕЎКІ САЦЫЯЛЬНЫЯ

### БЕЛАРУСКАЯ СТАРОНКА...

*Запісана ў г. Бабруйску*
*ад В. С. Клімовіч (1942 г. н.)*

Беларуская старонка
Славіцца абрусамі,
Бульбай, салам, самагонкай
І хлапцамі русымі.

*Запісала С. А. Клімовіч у 2007 г.*

### ЭХ, БУЛЬБАЧКА...

*Запісана ў г. Бабруйску*
*ад В. С. Клімовіч (1942 г. н.)*

Эх, бульбачка
Беларуская,
А гарэлачкі нагоняць,
Пішуць — руская.

*Запісала С. А. Клімовіч у 2007 г.*

### ВЫХАЖУ Я ЗА КАЛІТКУ...

*Запісана ў г. Бабруйску*
*ад В. С. Клімовіч (1942 г. н.)*

Выхажу я за калітку:
Два падкідышы ляжат,
Аднаму лет 48,
А другому 50.

*Запісала С. А. Клімовіч у 2007 г.*

## ГАВАРАТ, ШТО МОЙ МІЛЁНАК...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад М. М. Клімашонак (1934 г. н.)*

Гаварат, што мой мілёнак
Самагоначкі не п’е.
Паглядзелі б на яго —
Зямлю вухам дастае.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## ТРАКТАРЫСТЫ Ў КАЛГАСЕ...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Трактарысты ў калгасе
Кожны дзень гуляюць.
Усю салярку з трактароў
На самагон мяняюць.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## ПАЛЮБІЛА ТРАКТАРЫСТА...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад А. В. Бондар (1951 г. н.)*

Палюбіла трактарыста,
Толькі ўсё напрасна.
З-за гарэлкі ў яго
Ўся любоў пагасла.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## БРЫГАДЗІРАВА ЖАНА...

*Запісана ў в. Чарневічы Барысаўскага раёна ад М. М. Клімашонак (1934 г. н.)*

Брыгадзірава жана
У шубе нарадзілася:
Толькі выйшла за калітку,
Сразу прастудзілася.

*Запісала І. У. Райкевіч у 2007 г.*

## ПРЫПЕЎКІ СЯМЕЙНЫЯ

### НА ЧУЖОЙ СТАРОНАЧКЕ...

*Запісана ў в. Вожыкі Мінскага раёна*
*ад Г. В. Клімантовіч (1937 г. н.)*

На чужой староначке
Не клююць вароначкі.
Без радзімай мамачкі
Заклююць і галачкі.

*Запісала А. Ю. Якубік у 2008 г.*

### НА ЧУЖОЙ СТАРОНАЧЦЫ...

*Запісана ў в. Траянаўка Барысаўскага раёна*
*ад К. І. Кляшчонак (1928 г. н.)*

На чужой староначцы
Сонейка не грэе,
Без радзімай мамачкі
Ніхто не жалее.

*Запісала К. Ф. Кляшчонак у 1991 г.*

### ЗЛАЯ МАЯ МАМА...

*Запісана ў в. Вожыкі Мінскага раёна*
*ад Г. В. Клімантовіч (1937 г. н.)*

Злая мая мама,
Што мяне заставіла,
На чужую радзіму
Гараваць адправіла.

*Запісала А. Ю. Якубік у 2008 г.*

### ШТО Б Я ЗНАЛА МАЛАДАЯ...

*Запісана ў в. Міхайлаўка Светлагорскага раёна*
*ад А. Я. Сандрос (1935 г. н.)*

Што б я знала маладая,
Дзе мне замужам бываць,
Памагла б сваёй свякрусе
Хоць капусту паліваць.

*Запісала Ж. В. Сандрос у 1987 г.*

### ГУЛЯЙ, ГУЛЯЙ, ГУЛЯВОЙ...

*Запісана ў в. Бароніке Віцебскага раёна*
*ад Г. Я. Кіндзяевай (1910 г. н.)*

Гуляй, гуляй, гулявой
За бацькавай галавой.
Бацька бліноў напячэць,
Матка песню запяець.

*Запісала Л. А. Клімянок у 1992 г.*

## ПРЫПЕЎКІ ДА ТАНЦАЎ

### ОЙ, ТЫ, ПОЛЕЧКА-ТРАСУХА...

*Запісана ў п. Усяж Смалявіцкага раёна*
*ад А. С. Сухадольскай (1930 г. н.)*

Ой, ты, полечка-трасуха,
Да чаго ж ты давяла:
Я паследнюю кароўку
На базары прадала.

*Запісала Ю. І. Выдронак у 1990 г.*

### ОЙ, ТУФЛІ МАІ...

*Запісана ў в. Пешкі Бярозаўскага раёна*
*ад М. Л. Юдчыц (1936 г. н.)*

Ой, туфлі маі,
Наскі выстрачаны.
Не хацела танцаваць —
Самі выскачылі.

*Запісала Ж. В. Юдчыц у 1986 г.*

### ОЙ, ТОПНУ НАГОЙ...

*Запісана ў в. Бароніке Віцебскага раёна*
*ад Г. Я. Кіндзяевай (1910 г. н.)*

Ой, топну нагой
І прытопну другой.
Паглядзі-ка правая,
Што вытварае левая.

*Запісала Л. А. Клімянок у 1992 г.*

## СЯМЁНАЎНА

*Запісана ў в. Арэхаўка Круглянскага раёна*
*ад М. С. Якуцінай (1916 г. н.)*

Ай, Сямёнаўна,
Юбка ў клетачку,
Выпалняй сваю
Пяцілетачку.

Пяцілетачка
У чатыры годзіка,
А Сямёнаўна
Яшчэ малодзенька.

*Запісалі В. Рудзінская, А. Супруновіч,*
*А. Мухо ў 1978 г.*

## ЛЯВОНІХА

*Запісана ў в. Жухавічы Карэліцкага раёна*
*ад Я. І. Юшко (1933 г. н.)*

Ах, Лявоніха ты, любка мая,
Спамяну не раз ласкава цябе я:
Бровы чорныя й прыгожыя,
Вочы ясныя й вясёлыя.

*Запісала І. А. Штыцько ў 1972 г.*

*Запісана ў в. Жухавічы Карэліцкага раёна*
*ад Я. І. Юшко (1933 г. н.)*

Ах, Лявоніха, красавіца мая,
Ты спяваеш прыгажэй за салаўя.
Ух-ха, ух-ха, весяліцца душа!
А Лявоніха, як сонца, хараша.

*Запісала І. А. Штыцько ў 1972 г.*

*Запісана ў в. Пушча Лагойскага раёна*
*ад Г. П. Гарохавік*

Ой, Лявоніха, Лявоніха мая,
Несалёная капуста твая!
Несалёная, няварыная,
Толькі крышачку прыпарыная.

*Запісала А. К. Урбан*

## ДА НА РЭЧЦЫ, ДА НА ДОШЧАЧЦЫ...

*Запісана ў в. Рэпічы Баранавіцкага раёна*

Да на рэчцы, да на дошчачцы
Там дзяўчына да палошчацца,
Палошчыцца, умываецца,
У чаравічкі абуваецца:
— Чаравічкі мне й айцец покупіў,
Каб харошы маладзец палюбіў,
А панчошкі мне і матка дала,
Каб харошая паненка была.

## А ДА МЯНЕ ПАН ЯН ПРЫХАДЗІЎ...

*Запісана ў Барысаўскім раёне*
*ад Н. К. Васілеўскай (1922 г. н.)*

А да мяне пан Ян прыхадзіў,
Калошыну канапель пранасіў,
А я яму берасцень масла,
Каб прыходзіў цераз дзень часта.

*Запісала А. В. Усціновіч у 1979 г.*

# АПЫТАЛЬНІК ДЛЯ ЗБІРАННЯ МАТЭРЫЯЛАЎ ПА ТЭМЕ «ПАЗААБРАДАВЫЯ ПЕСНІ»

1. Дзе і калі спяваюцца песні пра каханне і сямейнае жыццё («за кудзеляй», «на бяседзе» і г. д.)? Пра што спяваецца ў такіх песнях: пра няшчаснае (шчаслівае) каханне (шлюб), вымушанае расстанне, жыццё з нялюбым (нялюбай), прыгнёт у сям'і мужа ці пра што іншае?

2. Ці ведаеце вы песні пра горкую долю ўдавы, беднай сястры, сіраты, прымака? Ці падзяляюцца такія песні на «жаночыя» і «мужчынскія»?

3. Ці захаваліся ў вёсцы песні пра наймітаў — бурлакоў, батракоў, чумакоў?

4. Ці ведаеце вы арыштанцкія і разбойніцкія песні?

5. Ці чулі вы песні пра паншчыну і прыгон, галоднае жыццё і цяжкую працу ў пана?

6. Ці спяваюць цяпер песні пра службу ў войску (казацкія, рэкруцкія, салдацкія)?

7. Ці ведаеце вы песні пра зборы казака на вайну, службу, вяртанне з паходу?

8. Дзе часцей за ўсё можна пачуць жартоўныя песні?

9. Якія вы ведаеце песні пра мужыка-п'яніцу (ці няўдаліцу), пра занадта мажную, тоўстую бабу, пра распусную, «гуляшчую» жонку, пра злую свякроў (ці цешчу), пра лянівую жонку (ці мужа), пра няўмелыя заляцанні хлопцаў і какецтва дзяўчат, пра бюракратаў-начальнікаў?

10. Ці спяваюць у вашай мясцовасці вясёлыя песні мужчыны? Як яны рэагуюць на крытыку ў свой адрас?

11. Ці любіце вы слухаць жаласныя песні? Ці выконваеце вы іх самі — адна ці з сяброўкамі, у бяседзе?

12. Пра што найчасцей пяецца ў жаласных песнях: пра няшчаснае каханне, пра рэўнасць, якая прыводзіць да трагедыі, пра помсту мужа

нявернай жонкі, пра сямейныя непаладкі, сваркі, якія трагічна заканчваюцца (жорсткія свякроў, цешча, адпаведна свёкар і цесць), пра сяброўку-разлучніцу?

13. Ці спяваюць жаласныя песні мужчыны, як яны ўвогуле да іх ставяцца?

14. Ад каго вы пачулі жаласныя песні: ад бабулі, маці, сяброваk?

15. Як у вашай мясцовасці называюць прыпеўкі — *частушкі*, *прыпеў*, *папеўка*, *падпявалка*, *скакуха*, *плясуха*, *круцёлка*, *дрындушка*, *таптушка*?

16. Якія прыпеўкі ў вашай вёсцы (пасёлку, горадзе) найбольш папулярныя: палітычныя, бытавыя, гумарыстычныя, сямейныя, любоўныя, любоўна-эратычныя, да танцаў?

17. Ці ведаеце вы прыпеўкі, якія спяваюць на вяселлях і хрэсьбінах, альбо такія, што выконваюцца як прыпеў да танца («Лявоніха», «Базар», «Шастак», «Кракавяк» і інш.)?

18. Ці вядомыя вам прыпеўкі, якія спяваюць толькі жанчыны або толькі мужчыны?

# ЛІТАРАТУРА

1. *Бахтин*, *В. С.* Частушка / В. С. Бахтин. М. ; Л., 1966.

2. Беларуская вусна-паэтычная творчасць : падручнік / К. П. Кабашнікаў [і інш.]. Мінск, 2000.

3. Беларускі фальклор : хрэстаматыя / склад. К. П. Кабашнікаў [і інш.]. Мінск, 1996.

4. Беларускі фальклор : вучэб. праграма для студэнтаў выш. навуч. устаноў, якія навучаюцца па спец. 1-21 05 01 «Беларуская філалогія» / аўт.-склад. Р. М. Кавалёва. Мінск, 2008.

5. Беларускі фальклор : энцык. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.] ; у 2 т. Т. 1. — Мінск, 2005 ; Т. 2. Мінск, 2006.

6. Беларускія народныя песні : са зборнікаў П. В. Шэйна / склад. К. П. Кабашнікаў. Мінск, 1962.

7. Беларускія частушкі / склад. К. П. Кабашнікаў, І. К. Цішчанка. Мінск, 1960.

8. *Василевич*, *В. А.* Восточнославянская юмористическая песня / В. А. Василевич. Минск, 1979.

9. Восточнославянский фольклор : слов. науч. и нар. терминологии. Минск, 1993.

10. Вянок беларускіх песень / зап. У. Раговіч. Мінск, 1988.

11. *Гілевіч*, *Н. С.* Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Слова і вобраз. Паэтычны сінтаксіс. Гукапіс і рыфма / Н. С. Гілевіч. Мінск, 1975.

12. Голас з невычэрпнай і жыватворнай крыніцы / склад. У. В. Анічэнка. Мінск, 1995.

13. *Гурскі*, *А. І.* Пазаабрадавая лірыка ўсходніх славян / А. І. Гурскі. Мінск, 2008.

14. *Гурскі*, *А. І.* Пазаабрадавая паэзія / А. І. Гурскі, Г. А. Пятроўская, Л. М.Салавей ; навук. рэд. А. С. Фядосік. Мінск, 2002. — (Беларускі фальклор. Жанры. Віды. Паэтыка ; Кн. 3).

15. *Гурскі*, *А. І.* Семантыка і паэтыка сямейнай лірыкі / А. І. Гурскі. Мінск, 2001.

16. *Гурскі*, *А. І.* Тайны народнай песні / А. І. Гурскі. Мінск, 1994.

17. *Гурскі*, *А. І.* Чаму вучыць народная песня / А. І. Гурскі. Мінск, 2007.

18. *Елатов*, *В. И.* Песни восточнославянской общности / В. И. Елатов. Минск, 1978.

19. Жартоўныя песні / склад. І. К. Цішчанка, С. Г. Нісневіч. Мінск, 1974.

20. *Кавалёва*, *Р. М.* Беларуская вусна-паэтычная творчасць : вучэб.-метад. комплекс / Р. М. Кавалёва. Мінск, 2005.

21. *Кавалёва*, *Р. М.* Фальклstyстыка : метад. дапам. для выкладчыкаў дысцыпліны «Фальклarystыка» ў выш. навуч. установах па спецыяльнасцях : 1-21 05 01 «Белару-

ская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка. Мінск, 2009.

22. *Кавалёва, Р. М.* Фальклорная практыка : метад. рэкам. і праграма-апытальнік для студэнтаў I курса філал. фак. па спец. 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка, Т. А. Марозава. Мінск, 2008.

23. *Кавалёва, Р. М.* Фалькларыстычны калейдаскоп : зб. арт. / Р. М. Кавалёва. Мінск, 2009.

24. *Кулагина, А. В.* Поэтический мир частушки / А. В. Кулагина. М., 1984.

25. *Ледаховіч, М.* Беларускія народныя песні Гродзеншчыны / М. Ледаховіч. Мінск, 1960.

26. Лірычныя песні / уклад. Н. С. Гілевіч. Мінск, 1978.

27. *Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева. Мінск, 1999.

28. *Мажэйка, З. Я.* Песні Баларускага Паазер'я / З. Я. Мажэйка. Мінск, 1981.

29. *Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. М., 1983.

30. *Мухаринская, Л. С.* Беларуская народная песня / Л. С. Мухаринская. Минск, 1977.

31. Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В. С. Цітова. Мінск, 2002.

32. Песні пра каханне / склад. І. К. Цішчанка, С. Г. Нісневіч. Мінск, 1978.

33. Песні савецкага часу / склад. Г. А. Барташэвіч. Мінск, 1970.

34. Песні сямі вёсак : Традыцыйная народная лірыка Міншчыны / уклад. Н. С. Гілевіч. Мінск, 1973.

35. *Петровская, Г. А.* Белорусские социально-бытовые песни / Г. А. Петровская. Минск, 1981.

36. *Приемко, О. В.* Фольклор славянских народов : учеб. программа для студентов I курса филол. фак. спец. 1-21 05 02 «Русская филология», 1-21 05 04 «Славянская филология» / О. В. Приемко. Минск, 2008.

37. Прыпеўкі / уклад. І. К. Цішчанка, Л. М. Фёдараў. Мінск, 1989.

38. Сацыяльна-бытавыя песні / уклад. І. К. Цішчанка, В. І. Скідан, Г. В. Таўлай. Мінск, 1987.

39. Сямейна-бытавыя песні / склад. І. К. Цішчанка, Г. В. Таўлай. Мінск, 1984.

40. *Тищенко, И. К.* Белорусская частушка : Вопросы генезиса жанра / И. К. Тищенко. Минск, 1969.

41. Фальклорная практыка : вучэб. праграма для студэнтаў I курса філал. фак., якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / склад. : Р. М. Кавалёва [і інш.]. Мінск, 2009.

42. Фалькларыстыка : тыпавая вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў па спецыльнасцях 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / склад. : У. В. Казакова, І. А. Швед. Мінск, 2009.

43. *Шырма, Р. Р.* Беларускія народныя песні : у 4 т. / Р. Р. Шырма. Т. 1. Мінск, 1959 ; Т. 2. Мінск, 1960 ; Т. 3. Мінск, 1962 ; Т. 4. Мінск, 1976.

# ЗМЕСТ

**ПРАДМОВА** .... 3

**I. БЫТАВЫЯ ПЕСНІ** .... 5
Любоўныя песні (песні пра каханне) .... 7
Сямейныя песні .... 16
Сіроцкія і ўдовіны песні .... 22
Прымацкія песні .... 33
Элегічныя песні .... 34

**II. САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЕСНІ** .... 38
Антыпрыгонніцкія песні .... 41
Рэкруцкія і салдацкія песні .... 46
Казацкія песні .... 57
Арыштанцкія песні .... 63
Чумацкія песні .... 66
Найміцкія песні .... 72

**III. ЖОРСТКІ РАМАНС** .... 75

**IV. ЖАРТОЎНА-ГУМАРЫСТЫЧНЫЯ І САТЫРЫЧНЫЯ ПЕСНІ** .... 86

**V. ПРЫПЕЎКІ** .... 98
Прыпеўкі любоўныя .... 98
Прыпеўкі любоўна-эратычныя .... 101
Прыпеўкі гумарыстычныя .... 103
Прыпеўкі сацыяльныя .... 105
Прыпеўкі сямейныя .... 107
Прыпеўкі да танцаў .... 108

**АПЫТАЛЬНІК ДЛЯ ЗБІРАННЯ МАТЭРЫЯЛАЎ ПА ТЭМЕ «ПАЗААБРАДАВЫЯ ПЕСНІ»** .... 111

**ЛІТАРАТУРА** .... 113

Вучэбнае выданне

# ПАЗААБРАДАВЫЯ ПЕСНІ

**Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорнай практыкі студэнтаў І курса філалагічнага факультэта**


Складальнікі
**Прыемка** Вольга Віктараўна
**Марозава** Таццяна Анатольеўна
**Лук'янава** Таццяна Валер'еўна і інш.



Рэдактар *Г. В. Мыцык*
Мастак вокладкі *Т. Ю. Таран*
Тэхнічны рэдактар *Т. К. Рамановіч*
Карэктар *А. В. Дзямідава*
Камп'ютарная вёрстка *Я. У. Заічанка*

Падпісана да друку 12.08.2010. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Гарнітура Petersburg. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 6,74. Ул.-выд. арк. 7,86.
Тыраж 100 экз. Зак.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
ЛВ № 02330/0494425 ад 08.04.2009.
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.